WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 112
(26720)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам V Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні»

«Сардэчна вітаю форум, які сабраў на беларускай зямлі ў год 65-годдзя Вялікай Перамогі прадстаўнікоў медыясуполак блізкага і далёкага замежжа, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Журналістаў нездарма называюць чацвёртай уладай. Ад вашага прафесійнага майстэрства і таленту, а галоўнае, прынцыповасці і праўдзівасці залежыць і развіццё цэлых дзяржаў, і дасягненне ўзаемаразумення паміж рознымі нацыямі і народамі». Прэзідэнт перакананы, што інфармацыйная прастора не павінна станавіцца арэнай распальвання міждзяржаўнай, сацыяльнай або рэлігійнай варожасці. «Ва ўмовах адкрытасці дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям медыйнага поля сёння, як ніколі раней, грамадствам запатрабавана стваральная роля журналістаў, іх магчымасць і здольнасць пазітыўна ўплываць на якасць жыцця сучаснага чалавека», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што гэта юбілейная сустрэча будзе садзейнічаць умацаванню ўзаемадзеяння Беларусі з іншымі дзяржавамі, дазволіць сфарміраваць аб'ектыўнае меркаванне пра нашу цудоўную краіну.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎСЯ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ У РАСІЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю.**

На 11 чэрвеня запланаваны сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым і Старшынёй Урада РФ Уладзімірам Пуціным, а таксама наведванне Усерасійскага навукова-даследчага інстытута электрамеханікі. Асноўнай тэмай сустрэч стануць пытанні функцыянавання Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Парадак дня перагавораў таксама ўключае шэраг актуальных пытанняў двухбаковага беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

Напярэдадні двухбаковай сустрэчы на вышэйшым узроўні адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Расіі. У гутарцы кіраўнікі дзяржаў вызначылі прыкладны пералік пытанняў, якія плануецца абмеркаваць. Беларускі бок выказаў пажаданне, каб сустрэча была максімальна канкрэтнай і выніковай.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ДЫРЭКТЫВАЙ № 4 ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ БЕЛАРУСІ БУДЗЕ АКАЗАНА МАКСІМАЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА ДЗЯРЖАВЫ

**Аб гэтым заявіў 9 чэрвеня кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей на пасяджэнні Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта, паведамляе БЕЛТА.**

«Цяпер прадпрымальніку будзе аказана максімальная падтрымка. Але таму прадпрымальніку, які будзе займацца канкрэтнай вытворчасцю, канкрэтнай справай, які забяспечыць стварэнне пэўнай колькасці рабочых месцаў», — адзначыў Уладзімір Макей.

Асноўнай тэмай пасяджэння Грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі стала распрацоўка праекта Дырэктывы № 4 па далейшай лібералізацыі эканомікі. «Я ўпэўнены, што сёння гэта вельмі важнае пытанне для ўсёй краіны, для кожнага грамадзяніна, — адзначыў кіраўнік прэзідэнцкай Адміністрацыі. — У некаторых СМІ часам выказваецца думка, што работа ГКС — гэта нейкая прафанацыя, што яна не прыносіць нічога карыснага. Я абсалютна не згодны з такім падыходам». Уладзімір Макей падкрэсліў: «Многія хочуць змяненняў у нашай краіне. Змяненняў можна дасягнуць двума шляхамі: рэвалюцыяй або эвалюцыяй. Рэвалюцыі ўжо адбыліся ў некаторых суседніх краінах — і, як вы бачыце, усё вяртаецца на кругі свае, і вынікі не ўражваюць. Але ёсць спакойны, эвалюцыйны шлях развіцця, калі адбываюцца паступальныя змяненні ў эканоміцы, грамадскім укладзе і ў выніку адбываецца змяненне грамадскай свядомасці. Я думаю, што менавіта гэты шлях з'яўляецца правільным і прымальным для нашай краіны. Таму калі нехта хоча дасягнуць пэўных змяненняў, то да гэтага трэба прыкласці адпаведныя намаганні. Патрэбна карпатлівая, штодзённая, спакойная работа».

Удзельнікі пасяджэння ўнеслі мноства прапаноў наконт распрацоўкі праекта дырэктывы. У прыватнасці, асноўны дакладчык старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір Карагін засяродзіў увагу на неабходнасці развіцця эфектыўнага прыватна-дзяржаўнага партнёрства. «Трэба ўзмацніць ролю прадпрымальніцтва ў развіцці беларускай эканомікі. Адміністрацыйныя рэсурсы ў гэтым плане ў многім вычарпаны. І перспектыўная рэсурсная база сёння — гэта прыватная ініцыятыва людзей», — адзначыў ён. Калі б ва ўсіх сферах эканомікі дзяржава падтрымлівала ініцыятыву людзей так, як гэта адбываецца на прыкладзе ПВТ, то ў нас былі б значна больш уражальныя вынікі ў росце ВУП, экспарту і іншых паказчыкаў». Дакладчык прапанаваў заснаваць нацыянальнае агенцтва па камерцыялізацыі інавацый, што дасць магчымасць уключаць у абарот існуючыя напрацоўкі беларускай навукі. Акрамя таго, асаблівую ўвагу прапануецца ўдзяліць антыманапольным структурам, прызначаным забяспечыць сумленную і збалансаваную канкурэнцыю. Было таксама прапанавана больш інтэнсіўна задзейнічаць прадстаўнікоў бізнэсу і грамадзянскай супольнасці ў распрацоўцы законапраектаў.

Уладзімір Макей адзначыў, што ўсе прапановы, агучаныя на пасяджэнні, будуць даведзеныя да дзяржорганаў, адказных за развіццё эканомікі, інвестыцый і дзелавога клімату. Больш за тое, у далейшым члены ГКС змогуць рэгулярна прымаць удзел у пасяджэннях рабочых груп па падрыхтоўцы законапраектаў, якія датычацца эканамічнай лібералізацыі. Удзельнікі пасяджэння аказаліся аднадушныя ў тым, што неабходна аптымізаваць працэсы ў сферы адукацыі, каб нацыянальная сістэма адукацыі адэкватна адказвала на выклікі сучаснай сусветнай эканомікі. Менавіта таму наступнае пасяджэнне ГКС плануецца прысвяціць тэме ўдасканалення сістэмы адукацыі. Як чакаецца, чарговае пасяджэнне адбудзецца ў канцы жніўня — верасні гэтага года. Грамадска-кансультатыўны савет пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі быў створаны ў пачатку 2009 года. У яго склад увайшлі прадстаўнікі розных грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, іншых устаноў і арганізацый Беларусі. У прыватнасці, членамі ГКС з'яўляюцца Павел Якубовіч, Васіль Стражаў, Станіслаў Багданкевіч, Алег Трусаў, Міхаіл Чаргінец, Тацяна Голубева, Генадзь Давыдзька і інш. Асноўная мэта ГКС — абмеркаванне актуальных пытанняў развіцця дзяржавы і грамадства, выпрацоўка прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства краіны. Старшыня ГКС — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей.

## УЗЯЦЬ РОЙ ГОЛЫМІ РУКАМІ

— Цяпер ад пчальніка далёка не адыдзеш, бо ў любы момант можа вылецець рой, — кажа пчаляр-аматар са шматгадовым стажам Віктар Казлоўскі. — Раней я заўсёды планаваў свае адпачынкі якраз на гэтую адказную пару. Раенне пчол — да таго ж сапраўдная навука, без ведання якой вядзенне мядовай вытворчасці немагчымае.

Толькі на першы погляд здаецца, што сонечная пасека сярод духмяных кветак — лёгкі і прыгожы занятак вяскоўца ці дачніка, адпачынак. А залацісты мядок на сподачку — падарунак добрай і бесклапотнай пчалы. Нават адна пчалярская амуніцыя сведчыць, што праца з пчоламі патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі, дасканалага ведання справы і немалых матэрыяльных затрат. А колькі ўсялякіх прылад і сродкаў абароны спадарожнічаюць у гэтым занятку! І яшчэ. Без сапраўднай смеласці і гатоўнасці быць уджаленым ісці ў пчалярства не варта.

Колькі ні чытай кніжак, але толькі ўласны досвед і практыка робяць аматара-пачаткоўца сапраўдным майстрам пчаліна-мядовай справы, сцвярджае Віктар Казлоўскі. У яго цяпер каля трыццаці дзясяткаў пчаласем'яў, і ад умення высачыць момант раення, знайсці вылецелы рой, зняць яго з дрэва з дапамогаю пасткі і перасадзіць у свабодны вулей, яго пчаліны гарадок можа значна павялічыцца. Бывае, што за дзень яму даводзіцца лавіць па два-тры раі, і гэта азначае, што на столькі новых вулляў павялічваецца ягоная мядовая фабрыка.

— Сёлета надвор'е самае спрыяльнае добраму медазбору і, зразумела, чым болей пчол, тым багацейшы будзе гэты карысны здаровы ўраджай, — кажа Віктар і па стромкай лесвіцы жвава ўзбіраецца да самай вяршаліны старой яблыні, каб стрэсці клубок пчол у спецыяльную пастку.

З-за хмары парушаных пчол я бачу толькі сілуэт пчаляра, а ад суцэльнага пчалінага гуду адчуваю, як ледзянее кроў і баюся, што фотасесія можа скончыцца для мяне не самым лепшым чынам (напэўна, гэта першая прыкмета, што пчаляр з мяне не атрымаецца). Але як па камандзе рой сціхае і злятаецца ў круглую фанерную скрыначку. Больш за ўсё мяне ўражвае, што Віктар робіць гэта голымі рукамі.

— Няўжо ні адна не ўкусіла? — пытаюся. Казлоўскі толькі ўсміхаецца: чаму яны будуць мяне кусаць, яны ж мяне ведаюць.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

*в. Хаценчыцы, Вілейскі раён.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДЛЯ МАЛАДЫХ СЕМ'ЯЎ ЖЫЛЛЁВЫЯ КРЭДЫТЫ СТАНУЦЬ БОЛЬШ ПРЫВАБНЫМІ

**ГЭТЫМІ днямі спецыялісты будаўнічай галіны падрыхтавалі праект указа, дзе прапісаны змяненні і дапаўненні ў нарматыўныя дакументы па пытаннях жыллёвага будаўніцтва.**

**Начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ** паведаміў рэдакцыі, што гэтым праектам указа прапануецца распаўсюдзіць існуючыя ўмовы льготнага крэдытавання будаўніцтва жылля, якія цяпер дзейнічаюць у населеных пунктах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек і на гарады, у якіх жыве да 50 тысяч чалавек. Такім чынам, і ў сярэдніх гарадках ільготны жыллёвы крэдыт будзе выдавацца чаргавікам пад 3 працэнты гадавых тэрмінам на 40 гадоў. Згодна з падрыхтаванымі дапаўненнямі, пры дастатковым фінансаванні, разглядаецца магчымасць памяншыць працэнтную стаўку па льготных жыллёвых крэдытах для такіх невялікіх гарадоў нават да 1 працэнта гадавых.

Другім слушным момантам праекта новага ўказа з'яўляецца прапанова аб зніжэнні працэнтнай стаўкі льготных жыллёвых крэдытаў да 3 працэнтаў гадавых для маладых сем'яў, якія маюць дваіх няпоўнагадовых дзяцей, у гарадах з насельніцтвам больш за 50 тысяч чалавек. Сёння льготны крэдыт пад будаўніцтва жылля для такіх сем'яў выдаецца пад 5 працэнтаў гадавых. Спецыялістамі Мінбудархітэктуры падлічана, што гэтай нормай могуць скарыстацца да 90 тысяч маладых сем'яў. Адначасова гэтым дакументам вызначаецца далейшае дэталёвае ўдакладненне катэгорыі маладая сям'я, згодна з рознымі жыццёвымі сітуацыямі, якія ўзнікаюць на практыцы падчас крэдытавання такіх сем'яў.

Праект указа дазваляе шматдзетным сем'ям, якія будуюць жыллё ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 50 тысяч чалавек, атрымліваць дадатковы льготны крэдыт для будаўніцтва гаспадарчых пабудоў у памеры да 20 працэнтаў ад кошту будаўніцтва нарматыўнай ільготнай крэдытуемай плошчы.

Удакладняецца і спрашчаецца льготнае крэдытаванне сем'яў і асобных чаргавікоў, якія будуюць жыллё за межамі тых населеных пунктаў, у якіх яны жывуць. Пашыраецца магчымасць такога будаўніцтва. Праектам указа разглядаюцца розныя спрэчныя працоўныя моманты, якія ўзнікаюць пры афармленні крэдытаў, калі сем'і жывуць у адным горадзе ці раёне, а будуюцца ў іншым. Нагадаем, што гэтае новаўвядзенне датычыцца розных населеных пунктаў у межах адной вобласці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Па чутках і кампетэнтна

## КАМУ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ 100-ДОЛАРАВЫЯ «ФРАНКЛІНЫ»?..

### «Ажылі» меркаванні, што старыя банкноты могуць неўзабаве ператварыцца ў звычайныя зялёныя паперкі

**ПРАБЛЕМЫ еўра неяк адцягнулі ўвагу ад яго «заклятага сябра» — долара: свет нават «засумаваў» ад недахопу трагічных сцэнарыяў аб лёсе амерыканскай валюты. Мабыць, схамянуўшыся ад такога ўпушчэння і згадаўшы леташнія прагнозы, асобныя аналітыкі зноў наступілі на «пяту» «амерыканцу» — маўляў, крах долара не за гарамі. Карацей, загучала старая песня, аднак, улічваючы вялікую цікавасць людзей да гэтага пытання, пра галоўнае — лёс у амерыканскай валюты незайздросны, яна ў хуткім часе можа ператварыцца ў звычайныя зялёныя паперкі.**

Што ж, не сумняваемся, што падобнае меркаванне здольнае зачапіць за жывое асабліва ўражлівых. Толькі вось існуючыя ў Злучаных Штатаў праблемы, якія эксперты не адмаўляюць, пры гучных вышэйзгаданых прадказаннях могуць істотна паказытаць нервы і абывацелям іншых краін: людзі, якія зберагаюць грошы ў валюце, востра рэагуюць на ўсялякія апакаліптычныя заявы. Хоць бы на тое, што развал ЗША непазбежны, а вырашаць праблемы амерыканцы могуць у тым выпадку, калі на старых 100-доларавых купюрах пастаў яць крыж, спыніўшы іх прыём. **Вядомы эксперт, загадчык кафедры Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ Георгій ГРЫЦ** скептычна адносіцца да апошніх пужалак, пра што ён і заявіў у гутарцы з нашым карэспандэнтам.

> **Падрыў любой буйной валюты ў прынцыпе немагчымы: сусветная супольнасць пойдзе на ўсё, каб гэтага не дапусціць.**

СТАР. 2

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.06.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 018,00 |
| 1 еўра | 3 632,77 |
| 1 латвійскі лат | 5 123,94 |
| 1 літоўскі літ | 1 050,38 |
| 1 чэшская крона | 139,46 |
| 1 польскі злоты | 875,70 |
| 1 расійскі рубель | 95,58 |
| 1 украінская грыўня | 381,16 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 31,7302 |
| 10 UAH | 40,0659 |
| 1000 BYR | 10,5206 |
| EUR | 37,9430 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

15 чэрвеня 2010 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ

КУПП «Виттекс» в г. Витебске по ул. Володарского, 100.

ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.

Информация на сайте: www.vitinvest.biz
Тел.: 431 498; +375336480387 (МТС).

УНП 300149663

Андрэй КАНСТАНЦІНАЎ:

Эксперты медыяфоруму

## «У ЖУРНАЛІСТЫЦЫ — ЯК У СПОРЦЕ: ТЫ ПАВІНЕН ЛЮБІЦЬ ТРЭНІРОЎКІ, А НЕ МЕДАЛІ»

**ЯГО першая кніга выйшла на шведскай мове. Але пісьменнікам Канстанцінаў быць не збіраўся. Ён паступаў на факультэт усходніх моў, каб быць перакладчыкам, а стаў... журналістам. У Беларусі імя гэтага расійскага журналіста вядомае ў першую чаргу па серыяле «Бандыцкі Пецярбург», сааўтарам сцэнара да якога і быў Канстанцінаў. Між іншым, якраз па яго раманах «Адвакат» і «Журналіст» серыял і здымаўся.**

**На міжнародным медыяфоруме, на базе якога працавала Летняя школа журналістыкі, Андрэй Канстанцінаў правёў спецыялізаваныя майстар-класы па расследчай журналістыцы. «Звяздзе» масціты журналіст распавёў пра свой шлях у прафесію. Расказаў пра мары, калег-журналістаў і пра тое, за што журналістыку не любіць:**



Фота з асабістага архіву А. КАНСТАНЦІНАВА.

— Дваццаць гадоў таму я не быў журналістам. Я быў ваенным перакладчыкам і знаходзіўся ў Лівіі. На той час у мяне былі зусім іншыя думкі пра будучае жыццё...

**— Як далучыліся да журналістыкі?**

— У 1991 годзе я вярнуўся з Лівіі, звольніўся з арміі і прыйшоў працаваць у пецярбургскую газету «Змена». Гэта быў такі час, калі старая журналістыка, груба кажучы, ужо памірала, а новая яшчэ толькі зараджалася. Якраз у той перыяд прыйшло шмат людзей без профільнай журналісцкай адукацыі. З другога боку, у мяне базавая гуманітарная адукацыя была нядрэннай. Я скончыў усходні факультэт Ленінградскага ўніверсітэта, таму адчуванне таго, што ў веданні гісторыі ці літаратуры сваім калегам-журналістам я прайграю, у мяне не было. Так я і пачаў свой журналісцкі шлях. Відаць, так распарадзіўся лёс...

**— Верыце ў лёс?**

— Не ведаю. Калі нават і веру, то не да фаталістычнага фанатызму. Ёсць людзі, якія вераць у лёс і нічога не робяць — лічаць, што ўсё прадвызначана. Я веру ў тое, што лёс ёсць, але чалавек, калі не будзе сядзець склаўшы рукі, зможа на яго паўплываць.

> **«Сёння людзі арыентаваныя на поспех: працаваць у прэстыжных СМІ і атрымліваць добрыя заробкі, рабіць тое, што загадаюць. Гэта сумна».**

**— Журналістам з якімі якасцямі вы б не раілі займацца журналісцкім расследаваннем?**

— Чалавеку з бухгалтарскім складам душы і розуму ў гэтым кірунку, відаць, цяжэй будзе знайсці прымяненне. Але калі гэтую працу дыферэнцаваць, як у агенцтве, дзе працую я (адзін інфармацыю збірае, другі яе сістэматызуе, трэці яе асэнсоўвае), то такія педантычныя рысы, можа, і падыдуць. Але найперш у чалавеку павінна быць закладзена цяга да авантуры, жаданне пайсці насустрач складанасцям, быць гатовым да цяжкасцяў і, вядома, асабліваe хваляванне душы. Сёння моладзь як кажа: я хачу стаць журналістам. І пад «я хачу стаць» яна разумее «я люблю не саму работу, а тое, што яна дае». А вось гэта памылка: калі ты не любіш сам працэс, які зусім не феерычны, нічога не атрымаецца. Патрэбна любіць карпатлівую працу, часам нават манатонную. Калі ты хочаш быць спартменам, ты павінен любіць трэніроўкі: працу, пот і траўмы, а не той момант, калі ты стаіш перад камерамі і атрымліваеш медалі.

**— Ці часта падчас расследавання вы карыстаецеся метадам маскі?**

— Калі шчыра, то рэдка. Па-першае, гэта не зусім законна. Па-другое, не зусім бяспечна. Гэты метад дазваляе атрымаць аператыўную інфармацыю, але ён жа і замаруджвае далейшую яе легалізацыю. Бо мала інфармацыю расказаць, яе трэба ўмець даказаць і адстаяць у судзе. У Еўропе гэты метад чамусьці прыпісваюць немцу Гюнтэру Вальрафу. Гэта поўная лухта, таму што ў 1913 годзе шведская журналістка гэты метад ужо практыкавала, а ў нас усё тое самае рабіў Гіляроўскі яшчэ ў XIX стагоддзі. Я не ўпэўнены, што і Гіляроўскага варта называць вынаходнікам гэтага метаду — гэта тое самае, што і шукаць вынаходніка кола.

СТАР. 2

Прамая лінія

## ДАПАМОГА: КАМУ ШТО?

Падтрымка ветэранаў і інвалідаў, адрасная сацыяльная дапамога, сацыяльнае абслугоўванне на даму і магчымасць атрымання іншых сацыяльных паслуг — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Івана Пятровіча НАГІБІНА**. **«Прамая лінія» пройдзе 15 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 21 ці 292 38 92. Нумар для папярэдніх пытанняў — 287 17 57.**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## КЛУБНІЦ СЁЛЕТА БУДЗЕ БОЛЬШ. КАБ ЯШЧЭ І ЦЭНЫ НЕ «КУСАЛІСЯ»...

**Сёлета дзякуючы спрыяльнаму надвор'ю, калі і не падмарозіла, і не затапіла, і цяпла было ў меру, у Лунінецкім раёне — асноўным пастаўшчыку клубніц у краіне — чакаецца добры ўраджай салодкай ягады, які павінен, згодна з прагнозамі, істотна перавысіць леташні. Ды і сама ягада, натуральна, павінна быць смачнай.**

У прыватнасці, як расказала нам эканаміст Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства Аксана Сайко, калі летась у насельніцтва было закуплена 992,4 тоны клубніц, дык падчас сёлетняга сезону плануецца закупіць 1 500 тон салодкай ягады (на 1 100 тон з якіх раённае спажывецкае таварыства ўжо заключыла дагаворы на пастаўку перапрацоўчым заводам). Пры гэтым трэба ўлічыць, што на тэрыторыі раёна вядуць уласныя нарыхтоўкі і іншыя арганізацыі.

Літаральна днямі тут былі ўстаноўлены закупачныя цэны на клубніцы ад насельніцтва. Так, прымаць іх для вінаробчых заводаў будуць па 600 рублёў за кілаграм, салодкая ягада для кансервавых прадпрыемстваў будзе прымацца па 1 тысячы за кілаграм. Так званыя таварныя клубніцы насельніцтва зможа рэалізаваць нарыхтоўшчыкам з райпа па цане 2,5—3 тысячы рублёў за кілаграм. Праўда, самі масавыя нарыхтоўкі яшчэ не распачаліся, зазначыла Аксана Пятроўна, людзі хутчэй за ўсё панясуць ягады на прыёмныя пункты ў бліжэйшыя дні. Хоць клубніцы з Лунінецкага раёна ўжо можна набыць. Днямі ў Брэсце іх, напрыклад, прадавалі ў розніцу па 3 тысячы за кілаграм. У сталічных спальных мікрараёнах кілаграм салодкай ягады пад агульнай назвай «з-пад Брэста» побач са станцыямі метро ў гэтыя ж дні прапаноўвалі па 7—7,5 тысячы рублёў за кілаграм. Шмат ахвотных не назіралася: дарагаватыя пакуль першыя клубніцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЁННЯ І ЗАЎТРА МЕДЫКІ РЭКАМЕНДУЮЦЬ ГІПЕРТОНІКАМ І САРДЭЧНІКАМ ЗАСТАВАЦЦА ДОМА

**Паводле слоў урача-кардыёлага раённага кардыялагічнага цэнтра Фрунзенскага раёна Марыны Відзякінай, тэмпературу 28—29 градусаў па Цэльсію гіпертонікам і тым, хто пакутуе ад ішэмічнай хваробы сэрца, перажыць вельмі цяжка. Звычайна гэта пажылыя людзі, якія да таго ж дрэнна пераносяць духату.**

«Такім людзям пасля 11.00 рэкамендуецца не выходзіць з дома, кватэры, і пакуль не спадзе спякота, не завіхацца на дачных участках», — сказала Марына Відзякіна. Доктар таксама параіла сардэчнікам і гіпертонікам у спякотныя дні як мінімум двойчы ў суткі вымяраць узровень артэрыяльнага ціску. І ў залежнасці ад яго паказчыкаў зніжаць або павялічваць дозы прэпаратаў, якія яны прымаюць.

«Пры з'яўленні галавакружэння, галаўных боляў, пагаршэнні зроку, мільганні «мушак» перад вачыма, слабасці ў адной палове тулава, руцэ або назе, а таксама пагаршэнні мовы — неадкладна выклікайце хуткую. Названыя сімптомы могуць быць прыкметай пачатку інсульту», — папярэдзіла Марына Відзякіна.

Акрамя таго, пры ўзнікненні боляў у грудной клетцы, асабліва незнаёмых, якія не здымаюцца нітрагліцэрынам у спалучэнні з аспірынам, урач парэкамендавала адразу ж званіць у службу «103», інакш можа развіцца інфаркт міякарда. Увечары, перад тым як ісці спаць, праветрывайце памяшканне. Фортачкі або вокны пакідайце на ноч адчыненымі.

«І ні ў якім разе не ўжывайце алкаголь! Спіртныя напоі, нават калі яны слабаалкагольныя, узмацняюць або аслабляюць дзеянне лекаў. А там і да інсульту або інфаркту недалёка», — дадала Марына Відзякіна.

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

## ВЫПУСКНЫЯ ВЕЧАРЫ — БЕЗ СПІРТНОГА

**11 і 12 чэрвеня па ўсёй краіне пройдуць выпускныя вечары**

Як запэўнілі ў галоўным адукацыйным ведамстве, ніякіх забаронаў на сустрэчу выпускнікамі світанкаў сёлета не ўводзілася. Сустрэча выпускнікамі першага ў дарослым жыцці світанку — гэта прыгожая школьная традыцыя, якае перадаецца з пакалення ў пакаленне, дык чаму яна павінна перарвацца? Пачатак, працягласць і месца правядзення выпускных вечароў вызначаліся кіраўнікамі школ разам з бацькоўскімі камітэтамі і ўзгадняліся з мясцовымі органамі кіравання.

Праўда, падчас масавых гулянняў на гарадскіх вуліцах, у парках і сустрэчы світанку выпускнікоў абавязкова павінны суправаджаць дарослыя — педагагічныя работнікі ці бацькі адзінаццацікласнікаў. Такая норма ўтрымліваецца ў загадзе Міністэрства адукацыі аб правядзенні ў агульнаадукацыйных установах апошніх званкоў і выпускных вечароў. Кіраўнікі ўпраўленняў і аддзелаў адукацыі павінны паклапаціцца аб прыцягненні да аховы грамадскага парадку на выпускных вечарах прадстаўнікоў праваахоўных органаў. У функцыі кіраўнікоў упраўленняў і аддзелаў адукацыі ўваходзіць таксама кантроль за выхаваўчым зместам сцэнарыяў урачыстых мерапрыемстваў і іх ідэалагічнай накіраванасцю.

А вось спіртное на выпускных вечарах знаходзіцца пад строгай забаронай, незалежна ад таго, дзе праходзіць урачыстасць: у школьных сценах ці ва ўстановах культуры. І гэта таксама непарушная традыцыя...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

белагропромбанк — традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

**СООБЩАЕТ, ЧТО 18 ИЮНЯ 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 8 июня 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 16 июня 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 27 июня 2010 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 250 36 53.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

# «МЫ ЖУКІ, АЛЕ НЕ ЛОЖНЫЯ...»







**КАЖА пры сустрэчы 80-гадовы жыхар вёскі Пятро Мядзелец. Ён памятае, як некалі вёска называлася па-іншаму. Хоць мінула болей за 70 гадоў, дагэтуль ён і большасць жыхароў лічаць, што назва ў населенага пункта несапраўдная. І іх гэта крыўдзіць.**

— Да 1939 года, яшчэ пры Польшчы, вёска называлася Жукі Дольнэ, — кажа дзед Пятро. — Бо мы знаходзімся ў даліне. А вось суседняя вёска Жукі Горныя ляжыць на высокім месцы і ў яе адпаведная назва. Калі прыйшлі бальшавікі, дык перайначылі на свой лад і мы сталі Ложнымі, бо сапраўды нібыта ў лажбіне, а не ў даліне.



Па словах Пятра Адамавіча, у вёсцы жыве каля 30 чалавек. Ён — старэйшы, а суседскія дзеці Дзмітрый, Наталля і Валерыя (**на фотаздымку**) — самыя юныя жыхары Жукоў Ложных.

— Многія думаюць пра нас нядобра, быццам мы нейкія гультаі, хлусы і злодзеі. І ў гэтым вінаватая назва, — з крыўдаю кажа Пятро Мядзелец. — Гэта зусім не так, людзі ў нас працавітыя і веруючыя. Праўда, ёсць і выключэнні, але дзе іх цяпер няма.

Пра тое, што пенсіянер-удавец не гультай, сведчыць ягоны дагледжаны падворак, ахайна пабеленыя ў садзе яблынькі. Трымае карову, коніка, рыхтуе для іх сена. Час ад часу, як ёсць хвіліна і каму паслухаць, дастае свой гармонік. Ён — майстар на ўсе рукі.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*Шаркаўшчынскі раён.*

А хто ў дамку жыве?

# «І ПРАЗ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ МУЖ ПЕРАД АДЫХОДАМ НА РАБОТУ ЦАЛУЕ МЯНЕ»

**Карэспандэнт «Звязды» завітала ў госці да самых багатых аграгараджан у Шаркаўшчынскім раёне**



**Па дарозе ў аграгарадок Васюкі намеснік начальніка тутэйшага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання па жывёлагадоўлі Юрый Лабуць паабяцаў, што пазнаёміць з самай багатай сям'ёй у раёне. Багацце, паводле яго слоў, у тым, што маладыя людзі, акрамя траіх дзяцей, умудраюцца трымаць чатырох кароў, столькі ж свіней, тузін авечак, дзевяць курэй, пеўня, ката і сабаку. Якое было маё здзіўленне, калі высветлілася, што мы прыехалі не куды-небудзь, а да Юрыя дадому.**

## «На Юру магу пакінуць і дзяцей, і гаспадарку»

Вось ужо восьмы год пайшоў, як Юра з Марынай атрымалі ключы ад першага «прэзідэнцкага» дамка ў Васюках. Да гэтага на працягу двух гадоў маладая сям'я цяснілася ў Юрыных бацькоў.

— Першую карову — Рабіну — мы набылі ў гаспадарцы яшчэ на першым годзе сумеснага жыцця, — кажа гаспадар. — Яна справіла наваселле нават раней за нас. Неўзабаве з'явілася Пчолка, за ёй Сімка і Жмурка. Нам вельмі пашанцавала, хлявы раней будавалі вялікія, не тое што зараз: там тры каровы змяшчаліся, свінні і куры. Авечак і цялушку спачатку ставілі ў суседскі хлеў.

— З цягам часу (нам вельмі ў гэтым дапамог Юраў бацька) пабудавалі яшчэ адзін хлеў, варыўню, лазню, гараж, — уступае ў размову гаспадыня. — Не так даўно ад маёй бабулі перавезлі вуллі з пчоламі, таму цяпер і мёд у нас свой. Ды і наогул мы стараемся, каб усё, што толькі магчыма, было сваё. Малако, тварог, смятана, сыр, мяса, яйкі... Вырошчваем бульбу, памідоры, агуркі, перцы, баклажаны... На зіму ставім слоікаў 300—400. Летась Юру час дазваляў, дык ездзіў у грыбы, у ягады. Адных толькі чарніц нарыхтавалі пад літраў сто.

Летась за трох цялят і малако (улетку за дзень здаюць недзе па 80 літраў) дбайныя гаспадары атрымалі 14 мільёнаў. Гэта калі не лічыць грошай, атрыманых ад продажу авечак. Для сельскай мясцовасці, згадзіцеся, неблагі дадатак да зарплаты.

— Людзі пытаюцца: «Навошта вы душыцеся: трымаеце вялікую гаспадарку, а нічога асаблівага не маеце?». А я не сказала б, што мы душымся. Наадварот, нам гэта ў радасць. Тым больш столькі памочнікаў расце. Ды і што казаць, муж у мяне залаты. Кароў у чатыры рукі доім. На Юру, калі трэба, магу спакойна пакінуць і дзяцей, і гаспадарку. Напрыклад, ездзіла і ў Латвію да родных на вяселле, да іх жа на хрысціны, у Санкт-Пецярбург летам на два дні на экскурсію.

**— А чыя ідэя была завесці такую вялікую гаспадарку?**

— Мы абое выраслі ў працалюбівых сем'ях. Цешча і зараз трымае дзвюх кароў, авечак, свіней, а курам ды індыкам яна ўжо, пэўна, і ліку не ведае. У нас таксама, колькі сябе памятаю, было тры каровы. Зараз, праўда, калі тату далі групу, пакінулі толькі адну. Акрамя рагулі, бацькі гадуюць кабылу, свіней і курэй. Маці вырошчвае на продаж расаду памідораў, аднымі толькі клубніцамі ў яе засаджана сотак дзесяць.

— Я лічу, што нас бацькі выхоўвалі правільна. І ім ніколі не будзе за нас сорамна. Стараемся і сваіх дзяцей прывучыць да працы. Можа, уцягнуцца і не змогуць пасля, як і мы, без гаспадаркі. А можа, наадварот, не захочуць такога жыцця. Я, калі працавала загадчыцай фермы, набрала групу цялят, дык Саша дапамагала мне іх паіць малаком. І дома дзеці шкадуюць усіх жывёл: і маленькіх, і вялікіх.

— Косця ўчора спрабаваў даіць карову, — падміргвае дзевяцігадоваму сыну Юрый.

**— Ну і як поспехі?**

— Літр нейкі надаіў (*смяецца*).

## «Забірай сястрычку, а нам аддай карову»

— Марына, як вы паспяваеце і дзяцей выхоўваць, і з гаспадаркай упраўляцца?

— Раней было цяжэй, даводзілася хадзіць на поле даіць кароў з каляскай. Цяпер дзеці падраслі, сталі дапамагаць. І па гаспадарцы, і за Лерай прыглядзець. Для мяне трое дзяцей — гэта паўнавартасная сям'я, бо сама маю брата і сястру. У Юры ж толькі адна родная сястра. Мы ніколі не размаўлялі наконт таго, колькі ў нас будзе дзяцей. Адзінае што перад вяселлем Юра заявіў, што хоча, каб у яго была дачка Саша.

Спачатку нарадзіўся Косця, а крыху больш як праз год — дачушка Саша.

— Малодшую з нецярпеннем чакалі ўсе, акрамя Сашы. Яна ў свае пяць гадоў разумела, што, калі з'явіцца сястрычка, то яна ўжо не будзе адзінай любіміцай у таты.

— А мы якраз напярэдадні карову здалі на мясакамбінат. І сказалі дзецям, што за грошы, якія атрымалі, купім сястрычку. Саша адразу ж пабегла да суседкі і выпаліла: «Цёця Таня, забірай маю сястрычку, а нам аддай карову» (*смяюцца*).

— Усё стала на свае месцы пасля нараджэння Леры. Саша так палюбіла сястрычку, што ні на момант ад яе не адыходзіла. Лера яе доўгі час няняй называла. Мы ўжо і не ўяўляем, як магло Леркі ў нас не быць.

**— Зараз многія маладыя сем'і не спяшаюцца заводзіць дзяцей. Аргументуюць гэта тым, што спачатку трэба пажыць для сябе, нажыць нейкую маёмасць...**

— Мы прытрымліваемся іншай думкі: дасць Бог дзяцей, дасць і на дзяцей. Мы ніколі не складалі грошы рубель да рубля. Набывалі мэблю, машыну, траціліся на падарункі дзецям, родным, сябрам. І, як бачыце, жывём не горш за іншых. Адзінае, што працуем, пэўна, больш. Але гэта, на мой погляд, толькі збліжае нас. Бо калі ў людзей з'яўляецца шмат вольнага часу, яны пачынаюць ствараць сабе праблемы на пустым месцы. А ў нас проста няма часу, каб сядзець і пераліваць з пустога ў парожняе. Такога, каб «не ведаю, чым заняцца» ці «нешта мне сумна», у нас не бывае.

## «Засыпаў шуфлядку клубніцамі і зефірам»

Пазнаёміліся Марына з Юрам у Васюках. Юра прыйшоў працаваць у гаспадарку ветурачом, Марына — сакратаром у аддзеле кадраў.

— Я ўвесь час сядзела на тэлефоне, — распавядае гісторыю знаёмства з мужам Марына. — Часта тэлефанавалі і прасілі паклікаць Юру Лабуця. Так і пазнаёміліся. Пасля высветлілася, што невялікі кавалак дарогі дадому ў нас быў агульны. Калі пацяплела, пачалі разам на веласіпедах ездзіць. 30 верасня ружовае вяселле будзем адзначаць. Але і праз дзесяць гадоў муж перад адыходам на працу цалуе мяне (*усміхаецца*). Гэта шмат пра што гаворыць.

— Больш за тое, за дзесяць гадоў мы ні разу не крычалі адзін на аднаго, — дадае Юрый. — Нашы дзеці не бачылі дома скандалаў.

— Калі ўзнікае непаразуменне, мы проста нейкі час не размаўляем. Паходзім, астынем, а пасля спакойна пагаворым. Часам здараецца, што проста няма настрою. Але ж гэта не значыць, што трэба свой негатыў выліваць на дзяцей ці на мужа. Я тады іду палоць ці знаходжу іншы занятак — і ўсё праходзіць само сабой. Усе кажуць, што мы з Юрам па жыцці аптымісты. Так яно і ёсць.

**— Марына, падзяліцеся сакрэтам сямейнага шчасця.**

— А ніякага сакрэту і няма. Проста мы кахаем адзін аднаго, а калі кахаеш, то шмат што можаш дараваць. Я ніколі не крычу на мужа, калі ён зрэдку прыйдзе дадому нападпітку. Мы не дзелім абавязкі. Юра можа і есці прыгатаваць, і памыць, я таксама, калі яго няма, магу накасіць свінням. Стараемся берагчы адзін аднаго: калі я бачу, што сама спраўлюся, то другі раз не буджу Юру, даю адпачыць. Гэта бачаць дочкі, і я спадзяюся, што яны ў будучыні таксама будуць шанаваць сваіх мужоў. Юра ж, у сваю чаргу, добры прыклад для сына. Яшчэ калі мы сустракаліся, ён мне пастаянна рабіў сюрпрызы. Прыязджаю з абеду на працу, адчыняю шуфлядку, а яна ўся засыпаная клубніцамі, на наступны дзень — зефірам. Працягвае рабіць прыемнае і цяпер. Кветкі дорыць мне і з нагоды і без нагоды. Косця ніколі не бачыць, каб ён на мяне крычаў і, крый Божа, біў, як бывае ў якіх іншых сем'ях. І ўплыў мужа на сына ўжо сёння відавочны: зараз мне кампліменты паступаюць ад іх абодвух.

## «З горада прыязджаю, быццам з працы»

**— Вы ж абое вучыліся ў горадзе, няўжо не хацелася там застацца жыць?**

— Ніколі. Горад вельмі стамляе. Прыязджаеш дадому, быццам з працы. А тут у Васюках так добра. Рэчка побач, лес. Усіх апошнім часам цягне ў горад, такое адчуванне, што там мёдам намазана. Людзі гатовыя працаваць не па спецыяльнасці і куткі здымаць, абы толькі ў горадзе.

— Многія кажуць, што едуць у горад, бо там камфортна жыць. Дык і тут камфорт можна зрабіць, было б жаданне. Мы вось летась аддалі больш за два мільёны і прабурылі свідравіну: у нас цяпер ёсць вада і ў доме, і ў хляве. Да гэтага бралі ваду ў калодзежы, які быў разлічаны на два дамкі, таму вады пастаянна не хапала. Сёлета плануем зрабіць душ у доме, паставіць тытан, каб была гарачая вада.

— А маладым спецыялістам наогул даюць дамкі амаль з усімі выгодамі, як у горадзе. У такім жыве Марынiна сястра, яна зараз працуе галоўным аграномам у гаспадарцы і адначасова атрымлівае вышэйшую адукацыю ў Горках. Яе стрыечныя сёстры не раз клікалі ў Барысаў, дзе самі туляцца ў здымных кватэрах.

— Сястра не паехала, і правільна, я лічу. Ёй тут выдзелілі вялікі дом. Яна сама сабе гаспадыня. Адразу ж, на выгадных умовах, як малады спецыяліст, узяла ў крэдыт пральную машыну, тэлевізар, халадзільнік. За свае грошы купіла кухню, ложак. Абставілася — не ўсе пакоі, але ёй хапае. Усё ў яе ёсць для жыцця. І не трэба аддаваць невядома каму палову зарплаты штомесяц.

## «Мы рады, што наш тата падрос»

Не так даўно вызвалілася месца загадчыцы фермы, і Марына вырашыла выйсці з дэкрэтнага водпуску на працу загадзя. Выходзіла з такой умовай, што муж яе будзе па меры неабходнасці замяняць. Зладжана папрацавалі амаль месяц, як Юру нечакана прапанавалі месца намесніка начальніка раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.

— Я цяпер практычна цэлы дзень на працы. Пастаянна трэба ездзіць у камандзіроўкі. Таму гаспадарка і дзеці амаль цалкам леглі на плечы Марыны.

— Ужо праз тыдзень я зразумела, што нічога не паспяваю ні дома, ні на працы. Таму вырашыла не гнацца за доўгім рублём і звольнілася. Не хочацца пускаць дзяцей на самацёк, для мяне яны на першым месцы. А з такой гаспадаркай, як наша, галоднымі сядзець не будзем. Нягледзячы на тое, што нашы планы пасля навіны пра павышэнне рухнулі, мы, безумоўна, рады, што нашага тату прыкмецілі, што ён падрос. Юра выдатны спецыяліст і вельмі адказны чалавек. Больш за тое, ён, нават калі быў намеснікам старшыні СВК па жывёлагадоўлі, ніколі не цураўся іншай працы. Калі трэба, нават замяняў нашых даярак. Я перакананая, што і на новай пасадзе ён сябе пакажа найлепшым чынам.

Тры гадзіны, якія я правяла разам з гасціннай сям'ёй, прайшлі незаўважна. Марына заспяшалася, бо прыйшоў час даіць рагуляў.

На зваротнай дарозе Юрый расказваў, як яны сям'ёй прымалі ўдзел у конкурсе «Уладар сяла» (на вобласці ўзялі першае месца, на рэспубліцы — трэцяе), як яны з Марынай вазілі дзяцей у Паставы, каб паказаць страусаў, як перад Новым годам дружна ўпрыгожваюць вялікую ёлку на вуліцы і развешваюць, дзе толькі можна, каляровыя ліхтарыкі... Гаварыў шмат. А пасля на момант задумаўся. І пасля непрацяглай паўзы прамовіў: «Марына ў мяне самая лепшая. Адзіная ў свеце. Не ўяўляю, як бы я жыў без яе».

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара.**
*Шаркаўшчынскі раён.*

Выпрабавана на сабе

# «КОТ У МЯШКУ» НА ГАНДЛЁВЫМ ПРЫЛАЎКУ

## Як карэспандэнт «Звязды» абараняў свае правы звычайнага спажыўца

**ТЭМУ зваротаў у тыя ці іншыя інстанцыі і, адпаведна, рэакцыі на гэтыя звароты журналісты звычайна ўздымаюць, так бы мовіць, з боку, на прыкладзе іншых грамадзян. Калі прысутнічаеш на прыёмах па асабістых пытаннях, на «прамых лініях», што праводзяцца кіруючымі работнікамі, альбо калі правяраеш лісты ў рэдакцыю. Аднак выканаў свае службовыя абавязкі і ты — звычайны спажывец тых жа паслугаў, што і ўсе. Хіба што, мажліва, кожную сітуацыю спрабуеш ацаніць вокам не толькі шараговага спажыўца, але і журналіста. Добра гэта ці дрэнна, але такая ўжо прафесія...**

Пры гэтым адразу зазначу, што ні на адным этапе гісторыі, пра якую пойдзе размова ніжэй, аўтар гэтых радкоў спецыяльна не называўся работнікам СМІ, каб, вырашаючы асабістае пытанне, не атрымаць нейкіх «перавагаў» у параўнанні з іншымі. І вось што ў выніку атрымалася. Ці не атрымалася?

Пачыналася з... малака. Дакладней, з даволі распаўсюджанай, пэўна, звычкі даліваць яго ў каву. І вось уявіце сабе: учора ўвечары вы купілі пакет малака, паклалі ў халадзільнік, дакладна ведаеце, бо пазначана на ўпакоўцы, у які тэрмін трэба ўжыць гэту прадукцыю. У вашым выпадку наперадзе яшчэ некалькі дзён і, натуральна, раніцай абсалютна нішто не насцярожвае. Аднак...

Кава не «вытрымлівае» суседства з дабаўленым у яе прадуктам і выдае згусткі, падобныя на тыя, калі дадаць не малако ці вяршкі, а, дапусцім, кефір. Альбо нават малако, але з пратэрмінаваным тэрмінам прыдатнасці. Мажліва, камусьці падабаецца і такі сурагат, але я на падобны «сюрпрыз» не разлічваў. Таму выліваю тое, што атрымалася ў выніку змешвання кавы з невядомым мне прадуктам. А затым, не адкладваючы справу, як кажуць, у доўгую скрынку, прыступаю да абароны правоў спажыўца. Бяру пакет, у якім, паводле ўпакоўкі, малако вытворчасці вядомага прадпрыемства «Беллакт» з Ваўкавыска, і накіроўваюся ў гандлёвы цэнтр «Мока маркет» на вуліцы Горкага ў Гродне.

Тут жа высвятляецца, што з «катом у мяшку» на гандлёвым прылаўку сустрэўся не толькі я. Прадаўшчыца на адной з касаў кажа, што таксама ўчора ўзяла дахаты пакет малака таго ж прадпрыемства, каб зварыць кашу дзіцяці. Але ў выніку атрымалася такая ж няўдача, як у мяне з кавай. Дык, мо, і яшчэ нехта пацярпеў? І колькі можа быць такіх пакупнікоў?

Заходжу ў кабінет адміністрацыі крамы: «Я ваш пастаянны кліент. Учора купіў...» Уважліва слухаюць, нічога не пярэчаць. Больш за тое, просяць прабачэння (хоць на дадзены момант у мяне няма падстаў у нечым папракаць работнікаў гандлю) і вяртаюць грошы за гэты «няўдалы» пакет (хоць я гэтага і не патрабаваў, бо, зноў жа, трэба спачатку разабрацца, што здарылася з прадуктам). На якім этапе (на прадпрыемстве ці, можа, пры транспарціроўцы альбо ўжо ў гандлі) змесціва пакета стала адрозніваццa ад таго, што гарантуе ўпакоўка? І па якой прычыне? Дзе яно, тое слабое месца ў гэтым ланцужку? Каму і якія захады трэба рабіць, каб падобнае не паўтаралася?

Мяркуючы, што адміністрацыя крамы таксама зацікаўленая ў адказе на гэтыя пытанні, пакідаю пісьмовую заяву з выкладаннем вышэйзгаданай сітуацыі і прośбай у ёй разабрацца. На гэтым і развітваемся. Пакупнік пачынае чакаць рэакцыі на сваю заяву, аб'явіўшы на гэты час, да атрымання адказу, «мараторый» на ўжыванне ваўкавыскіх малочных прадуктаў. А кіраўніцтва гандлёвага прадпрыемства, як здаецца пакупніку, бярэцца, згодна з заканадаўствам аб зваротах грамадзян, за разгляд канкрэтнага звароту.

Нагадаем, якія абавязкі накладвае на службовых асобаў **Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 2004 года № 340-З «Аб зваротах грамадзян.»**

**Артыкул 9. Парадак разгляду пісьмовых зваротаў**

*Пісьмовыя звароты, накіраваныя ў дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі (службовым асобам) з выкананнем патрабаванняў гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб зваротах грамадзян, падлягаюць абавязковаму разгляду службовымі асобамі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, да кампетэнцыі якіх адносіцца вырашэнне пытанняў, выкладзеных у звароце.*

*Пісьмовыя звароты лічацца вырашанымі, калі пастаўленыя ў іх пытанні разгледжаны, прыняты неабходныя меры і грамадзянам пісьмова дадзены адказы ў тэрміны, названыя ў частках першай і другой артыкула 10 гэтага Закона.*

**Артыкул 10. Тэрміны разгляду зваротаў**

*Звароты павінны быць разгледжаны не пазней за адзін месяц з дня іх рэгістрацыі ў дзяржаўных органах, іншых арганізацыях, да кампетэнцыі якіх адносіцца вырашэнне пытанняў, выкладзеных у зваротах, а звароты, якія не патрабуюць дадатковага вывучэння і праверкі, — не пазней за пятнаццаць дзён, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Пры неабходнасці правядзення спецыяльнай праверкі, запыту неабходнай інфармацыі кіраўнікі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, у якія паступілі звароты, могуць падоўжыць названы тэрмін, але не больш чым на адзін месяц з адначасовым паведамленнем пра гэта грамадзянам.*

Вось так павінна быць па законе. А як жа ў маім выпадку? Месяц чакаю — як кажуць, ні адказу, ні прывітання. Другі мінае — і зноў ніякага рэагавання. Мо, заява не па тым адрасе? Калі так, то *«адмова ў разглядзе скаргі павінна быць пісьмова матываваная і накіраваная грамадзяніну ў пяцідзённы тэрмін»* (**артыкул 8 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян».** Не адмовілі. Тады чаму ж не рэагуюць? На якой падставе ігнаруецца патрабаванне артыкула 15 гэтага Закона да службовых асобаў, якія абавязаныя «*прымаць меры для поўнага, аб'ектыўнага, усебаковага і своечасовага разгляду зваротаў, пісьмова інфармаваць грамадзян аб рашэннях, прынятых па выніках разгляду пісьмовых зваротаў*»?

Накіроўваюся ў гандлёвы цэнтр «Мока маркет»: «Што з маёй заявай?» Дырэктар Лідзія Буцкевіч здзіўленая: «Няўжо дагэтуль не атрымалі адказу?» Паводле яе слоў, мой зварот пераадрасавалі ў ААТ «Беллакт». І з Ваўкавыска, на думку Л. Буцкевіч, мне і павінны былі адказаць. Хоць я звяртаўся не да вытворцаў, а на гандлёвае прадпрыемства, дзе набыў сумнеўную прадукцыю. А значыць, адтуль і павінен быў, згодна з вышэйзгаданымі заканадаўчымі нормамі, атрымаць адказ.

Што далей? Дырэктар крамы абяцае разабрацца ў сітуацыі і просіць прыйсці заўтра. Прыходжу. Лідзія Буцкевіч кажа, што быццам маю заяву ў Ваўкавыску згубілі, але са мной павінен звязацца прадстаўнік гэтага прадпрыемства. І сапраўды, на наступны дзень мне тэлефануе Кацярына Зубава, прадстаўнік ААТ «Беллакт» у Гродне. Паколькі ў вызначаны законам тэрмін пісьмовы адказ даваць ужо позна (зноў жа варта падкрэсліць, што адказаць павінны былі з гандлёвага цэнтра «Мока маркет», хоць спажывец, зразумела, быў бы не супраць і нейкага афіцыйнага каментару з боку малакаперапрацоўшчыкаў) сітуацыя «разрульваецца» ў вуснай форме.

Ад Кацярыны Зубавай даведваюся, што мой зварот у Ваўкавыску, аказваецца, не згублены, аднак прадстаўніку прадпрыемства ў горадзе над Нёманам стала вядома пра яго... літаральна два дні таму, калі пакупнік пачаў цікавіцца прычынай адсутнасці на сваю заяву двухмесячнай даўнасці. Чаму якасць прадукту не адпавядала таму, што пазначана на ўпакоўцы? Прадстаўнік «Беллакта» перакананая, што малако не магло скіснуць на этапе вытворчасці (кантроль вельмі строгі), транспарціроўкі (прадукцыю развозяць у халадзільніках) і таму, маўляў, не выключана, што гэта магло адбыцца ўжо пасля разгрузкі тавару на рампе крамы.

Зразумела, што цяпер гэта толькі версія і праз два месяцы ўжо немагчыма даказаць, што ж сапраўды здарылася з якасцю прадукцыі ў прынамсі двух пакетах малака, што былі набытыя аўтарам гэтых радкоў і работніцай той жа крамы. Але ж і даказваць не збіраліся. Калі б такое жаданне прысутнічала, дык па гарачых слядах, у той жа дзень, калі паступіла заява, можна (і трэба) было запрасіць у краму прадстаўніка прадпрыемства — вытворцы (тым больш, што ён знаходзіцца ў Гродне), і сумесна высветліць, што ж здарылася. І калі адбыўся нейкі промах (хто ж не памыляецца?), то шчыра яго прызнаць. Можа, нават падзякаваўшы пакупніку за яго адстойванне інтарэсаў спажыўцоў. І, безумоўна, зрабіўшы высновы для сябе, каб такіх «катоў у мяшку» больш на гандлёвых прылаўках не было. Бо гэта ж на агульную карысць. Пакупнікам — гарантыя якасці тавару. Тым, хто дзеля іх працуе і зарабляе грошы — прэстыж і, адпаведна, аб'ёмы рэалізацыі. Ці, мо, тут ніякай сувязі няма?

Аднак каму была патрэбная мая прынцыповасць...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ВЫПІЛА І «ПРЫСНУЛА» ДЗІЦЯ...

25-гадовая жыхарка Кобрына знаходзілася ў водпуску па доглядзе дзіцяці. Аднойчы маладзіца моцна выпіла і лягла спаць разам з дзіцем, якое нарадзілася ў гэтым годзе. У сне маці, відавочна, моцна прыціснула дзіця і яно задыхнулася. Гэта здарылася 8 мая, і вось праз месяц пракуратура раёна завяла крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## З ПАЧАТКУ ГОДА ВАДА ЗАБРАЛА ЖЫЦЦІ 24 МІНЧАН

З пачатку года ў вадаёмах і рэках краіны патанулі 24 мінчаніны. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» паведаміў старшыня Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД Фёдар Клюкач. Толькі за май — пачатак чэрвеня вада забрала жыцці 10 гараджан, у тым ліку траіх дзяцей. Большая частка трагедый адбылася на Мінскім моры і Цнянскім вадасховішчы. Асноўная прычына — невыкананне элементарных правілаў паводзінаў ля вады і на вадзе.

У той жа час прадстаўнікі АСВОДа выратавалі восем чалавек, са 150-цю праведзены растлумачальныя гутаркі — з тымі, хто парушаў правілы паводзінаў на вадзе і ля вады.

АСВОД прапануе набор простых парадаў для тых, хто купаецца і адпачывае на беразе:

— ні ў якім выпадку не ўваходзіць у ваду разгарачаным — магчымы тэрмамеханічны шок і спыненне сэрца;

— купацца толькі ў спецыяльна адведзеных месцах;

— плыць не ад берага на сярэдзіну, а ўздоўж берага, не заплываць за буйкі;

— калі ў вадзе нагу або руку звяло сутаргай — не панікаваць: расцерці, ушчыпнуць, размяць гэтую мышцу;

— ні ў якім разе не ўжываць алкаголь перад купаннем: нават невялікая доза выклікае парушэнне каардынацыі рухаў;

— не дапускайце свавольстваў на вадзе, не падавайце лжывых сігналаў аб дапамозе;

— тэмпература вады павінна быць не ніжэй за 20 градусаў па Цэльсію;

— у вадзе знаходзьцеся не больш як 15—20 хвілін; не давodзьце арганізм да дрыжыкаў.

**Дзяніс ГОЛУБ,**
*«Мінск—Навіны».*


Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **6 ліпеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 ліпеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 22.05.10 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 22.05.10 па 30.09.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1694 ад 13.05.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______
(аддзяленне сувязі)
______ **на III кв. або 2–е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ______
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**
ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______
(прозвішча, ініцыялы)
Куды ______
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

(індэкс выдання)

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______
(прозвішча, ініцыялы)
Куды ______
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

# ЗБОРНАЙ БЕЛАРУСІ НА КУБКУ СВЕТУ НЯМА. ЗА КАГО ХВАРЭЦЬ?

**ЧЭМПІЯНАТ свету па футболе, які сёння распачаўся ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, ужо паспеў заняць розумы заўзятараў. Пакуль шансы ва ўсіх камандаў роўныя, прыхільнікі гульні нумар адзін выказваюць свае меркаванні, хто з'яўляецца фаварытам і хто сёлета стане чэмпіёнам свету. Мы таксама папрасілі зрабіць прагноз на ПАР-2010 вядомых у свеце спорту асобаў.**

**Старшыня федэрацыі футбола Генадзь НЯВЫГЛАС** заявіў, што фаварытам турніру з'яўляецца зборная Англіі.

— Складана штосьці прагназаваць, але я ўсё-такі стаўлю на Англію. Там больш што нядаўна яны выйгралі чэмпіянат Еўропы, — падзяліўся старшыня федэрацыі падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай таварыскаму матчу зборных Беларусі і Швецыі.

**Галоўны трэнер нацыянальнай каманды Бернд ШТАНГЕ** выказаў такое меркаванне:

— Выйграе Іспанія. Упэўнены ў гэтым на 100 працэнтаў. У фінале яны адолеюць Аргенціну з лікам 1:0. Пераможны гол на 88-й хвіліне заб'е Фернанда Торэс.

**Міхаіл ВЕРГІЕНКА, чэмпіён СССР у складзе мінскага «Дынама», намеснік старшыні федэрацыі футбола**, таксама за Англію:

— Я мяркую, што адна з афрыканскіх камандаў абавязкова зробіць сюрпрыз на Кубку свету. А ў прызёрах будуць Англія, Іспанія і Аргенціна. Асабіста я буду перажываць за нашага суперніка па адборачнай групе — зборную Англіі.

**Сяргей ГУРЭНКА** хварэць плануе за італьянцаў — нядзіўна, бо ў кар'еры футбаліста былі італьянскія старонкі. Сюрпрызаў ён таксама чакае ад іспанцаў, а вось за зборнай Англіі будзе назіраць з цікавасцю — як зменіцца каманда ў руках Фабіа Капэла ў фінальнай частцы. У трэнерскі геній Марадоны Гурэнка не верыць. «Футбалісты ў камандзе добрыя, але шэраг трэнерскіх рашэнняў мне не падабаецца», — падзяліўся думкамі спецыяліст.

Так мяркуюць людзі, для якіх футбол — прафесія. А вось ці ўдасца мундзіялю, фінальная частка якога ўключае 64 матчы, адцягнуць ад штодзённых заняткаў астатніх беларусаў — пытанне. Тым больш што сярод 32 камандаў зборнай Беларусі няма. За каго ж яшчэ хварэць?

**Андрэй АРАМНАЎ, алімпійскі чэмпіён, цяжкая атлетыка:**

— Хутчэй за ўсё я не буду глядзець футбол. Нашай каманды там няма, хварэць няма за каго, правільна? Ну, толькі фінальны матч, магчыма, і гляну. Я не надта разбіраюся ў сусветным футболе, таму мне цяжка прадказаць, хто будзе змагацца ў фінале за чэмпіёнства.

**Ігар АСТАПКОВІЧ, прызёр Алімпійскіх гульняў, старшы трэнер па штурханнях нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы:**

— Футбол абавязкова пагляджу, асабліва фінальную частку. Хварэць буду за немцаў. А выйграюць аргенцінцы — так мне падказвае шостае пачуццё. Праўда, яно мяне толькі ў лёгкай атлетыцы не падводзіць, а ў футболе можа падвесці.

**Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА, спявачка і тэлевядучая:**

— Ну і задачку вы мне задалі... Калі шчыра, мне заўсёды цікава назіраць і хварэць за тыя каманды, дзе гуляюць мае знаёмыя. У ПАР жа нікога са знаёмых не будзе. Так што глядзець буду толькі выпадкова абраныя сустрэчы, дакладней тыя, якія будуць глядзець мае сябры — мужчыны ж не прапусцяць матч. А хварэю я ў такіх выпадках за прывабных футбалістаў. Мне падабаецца Крышціяну Раналду, вось за яго і буду перажываць.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АХМАДЗІНЕЖАДУ ДАЗВОЛЯЦЬ КУПІЦЬ С-300



**Расія згортвае ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва з Тэгеранам з-за ўведзеных напярэдадні Савбясам ААН санкцый.**

Аднак зенітна-ракетныя комплексы С-300 не падпадаюць пад абмежаванне, вызначанае апошняй рэзалюцыяй Савета бяспекі ААН па Іране, бо яны з'яўляюцца не наступальнай, а абарончай зброяй. Надоечы Савет Бяспекі ААН увёў новыя санкцыі ў дачыненні да Ірана, які не збіраецца спыняць сваю ядзерную праграму. Рэзалюцыя была прынятая большасцю галасоў, дакумент ухвалілі 12 краін, уключаючы Расію і Кітай.

### НА ВЯСЕЛЛІ ЗАГІНУЛА 39 ЧАЛАВЕК

**Не менш 39 чалавек загінула і яшчэ 73 былі параненыя ў выніку выбуху на вяселлі, якое праходзіла ў афганскай правінцыі Кандагар.**

Колькасць ахвяраў выбуху можа ўзрасці, паколькі пошукі целаў на месцы інцыдэнту працягваліся да канца дня. Выбух мог стаць вынікам нападу тэрарыста-смяротніка. Паўднёвая правінцыя Кандагар традыцыйна з'яўляецца адной з галоўных апор талібаў у Афганістане. Камандаванне войскаў НАТА разлічвае да 11 жніўня цалкам вярнуць пад кантроль афіцыйнага афганскага ўрада цэнтральны горад Кандагар. У сваю чаргу талібы таксама актывізавалі ваенныя дзеянні супраць войскаў НАТА. У прыватнасці, не далей як у аўторак у выніку нападу талібаў на аўтакалону НАТА загінулі дзесяць салдатаў кааліцыі.

### ШКОЛЬНІКІ ПАЗЯХАЮЦЬ АД ПРЭЗІДЭНЦКІХ ПРАМОЎ

**Прэзідэнт ЗША Барак Абама вядомы сваім красамоўствам, але падобна на тое, што прамоўніцкі талент амерыканскага лідара здольны ўразіць не кожнага.**

Падчас наведвання Абамам школы горада Каламазу (штат Мічыган) адзін з вучняў заснуў проста пасярод запальнага выступлення прэзідэнта, прысвечанага выпускнікам. Спачатку чарнаскуры хлопчык, які сядзеў за спінай прэзідэнта і таму патрапіў у аб'ектыў відэакамер, сумленна змагаўся са сном, пазяхаючы ва ўвесь рот і пацягваючыся. Калі ж прэзідэнт стаў успамінаць памылкі юнацтва і пераконваць выпускнікоў зацята працаваць, падлетак не вытрымаў, заплюшчыў вочы і заснуў, апусціўшы галаву на грудзі.

Кур'ёзная гісторыя з Абамам вельмі падобная на тую, якая адбылася з папярэднім прэзідэнтам ЗША Джорджам Бушам падчас яго выступлення ў 2004 годзе. Падчас перадвыбарнай прамовы Буша ў Арланда камеры заснялі хлопчыка, які бесперапынна пазяхаў.

### МАБІЛЬНІК МОЖНА БУДЗЕ ЗАРАДЖАЦЬ АД БОТАЎ



**Французская тэлекамунікацыйная кампанія выпусціла гумовыя боты, якія можна выкарыстоўваць для зарадкі акумулятара тэлефона**

Убудаваныя ў боты тэрмаэлементы пераўтвараць цяпло ад ступняў у электрычнасць, якая будзе зараджаць акумулятары. Такім чынам, чым цяплей нагам, тым даўжэй можна размаўляць. 12 гадзін хадзьбы ў «электработах» хопіць на тое, каб размаўляць па тэлефоне на працягу гадзіны. А аматарам доўгіх гутарак стваральнікі ботаў раяць ісці ў іх на дыскатэку. Боты-акумулятары будуць прадстаўлены на фестывалі Гластанберы.

### У АРМЕНІІ ЗНАЙШЛІ НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫ ЧАРАВІК

**Міжнародная археалагічная экспедыцыя, якая працуе ў правінцыі Вайёц Дзор на поўдні Арменіі, каля іранскай мяжы, знайшла найстаражытнейшы ў свеце чаравік.**



Чаравік прыблізна 37-га памеру зроблены са скуры і мае шнураванне. Узоры скуры былі незалежна датаваныя радыявугляродным метадам у дзвюх лабараторыях у Вялікабрытаніі і ЗША. Іх вынікі супалі: знаходцы каля 5,5 тысячы гадоў. Дагэтуль найстаражытнейшымі ў свеце чаравікамі лічыўся абутак «ледзянога чалавека» Отцы, рэштkі якога былі знойдзены ў ледавіку ў Альпах у 1991 годзе. Отцы жыў каля 5300 гадоў таму.

**Прамая лінія**

### ЭНДАКРЫННАЯ СІСТЭМА

Дыягностыка і лячэнне цукровага дыябету 1-га і 2-га тыпаў, захворванняў шчытападобнай залозы, прафілактыка эндакрыннай паталогіі будуць у цэнтры ўвагі «прамой лініі» з удзелам **загадчыцы эндакрыналагічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Алены Іванаўны КУЗЬМЯНКОВАЙ**.

Задаць пытанні спецыялісту можна **18 чэрвеня, у пятніцу, з 14.00 да 15.30** па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

Папярэднія пытанні прымаюцца па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.


ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ 2010 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 12 400 рублёў на месяц 74 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 11 600 рублёў на месяц 69 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 900 рублёў на месяц 119 400 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 000 рублёў на месяц 108 000 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9 700—11 180 рублёў на месяц 58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 940—10 430 рублёў на месяц 53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13 134—14 080 рублёў на месяц 78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12 230—13 170 рублёў на месяц 73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна


**Знойдзена ў архіве**

# 1945 год: вяртанне на Беларусь... коней

**НА 1 студзеня 1945 года ў Беларусі іх налічвалася ўсяго 577 138 галоў, або 49,7 % ад даваеннай колькасці. Да канца 1945 года пагалоўе коней павялічылася амаль на 80 тысяч у большай ступені за кошт трафейных коней і коней ад расфарміраваных часцей Чырвонай Арміі. Як жа праходзіў гэты шматмесячны цяжкі конскі марафон з тэрыторыі Германіі і Польшчы ў нашу краіну? Звернемся да дакументаў архіва.**

Да прыняцця дзяржаўнай праграмы перагону трафейнай жывёлы ўжо адразу пасля вызвалення Беларусі па ініцыятыве Беларускага ўрада былі прыняты меры аднаўлення конскага пагалоўя. Так, 17 ліпеня 1944 года намеснік старшыні СНК БССР К.В. Кісялёў накіроўвае лісты камандуючым Беларускімі франтамі з просьбай перадаць Наркамзему Беларускай ССР «племянных жарабцоў, кабыл і жарабят, а таксама ўсіх лішніх карыстальных коней: трафейных, выбракаваных і іншых».

Трэба адзначыць, што камандаванне франтоў з разуменнем ставілася да патрэбаў краіны, і да канца 1944 года коні пачалі паступаць.

19 снежня намеснік старшыні СНК БССР І.А. Крупеня лістом на імя начальніка Каўнаскай чыгункі просіць выдзеліць 47 вагонаў для атрымання коней ад 3-га Беларускага фронту. У гэтым жа месяцы Міністэрствам замежных спраў БССР афармлена 25 пропускаў калгаснікам Смалявіцкага раёна для праезду ў Польшчу па атрыманне 240 коней, выдзеленых вайсковымі часцямі 1-га Беларускага фронту.

14 сакавіка 1945 года выйшла пастанова Дзяржаўнага камітэта абароны СССР «Аб перадачы калгасам Беларусі трафейных коней». Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б 20 сакавіка прынялі сваю пастанову, у якой ставілася ў абавязак Наркамзема, аблвыканкамаў і абкамаў КП(б)Б не пазней за 15 мая 1945 года забяспечыць перагон 5,5 тысячы трафейных коней і 2,5 тысячы жарабят з зонаў дзеяння 1, 2 і 3-га Беларускіх франтоў.

Для збору, прыёмкі, гуртоўкі, догляду і перагону жывёлы і коней у зоны Беларускіх франтоў накіроўвалася 8879 чалавек. З іх — 182 абласныя і раённыя ўпаўнаважаныя, 105 заветработнікаў, 8592 калгаснікі-гоншчыкі і 4 упаўнаважаныя Саўнаркама БССР. Для перагону жывёлы ў Беларусь і іншыя вобласці СССР было распрацавана 12 трас і 11 уваходных пунктаў на мяжы Беларускай ССР. На ўсіх трасах вызначаны дыспетчарскія і ветэрынарна-кантрольныя пункты. У абласцях былі створаны апаратыўныя групы па садзейнічанні перагону.

Для аховы жывёлы на ўваходных пунктах і пры перагоне па трасах прызначаны каманды войскаў НКУС.

Трэба было адправіць у Беларусь не 5,5 тысячы галоў, а 7 тысяч трафейных коней і, самае важнае, калгасам прадпісвалася выкупляць коней праз абласныя нарыхтоўчыя жывёлаканторы за поўны кошт. Праўда, калгасам выдзяляўся крэдыт з яго пагашэннем на працягу трох гадоў. Але ўсё адно гэтая пакупка клалася цяжарам на мізэрны бюджэт калгасаў.

Выходзяць адна за другой пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б па гэтым пытанні. 21 жніўня 1945 года на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б зноў разглядалася пытанне аб размеркаванні коней, якіх атрымлівалі ад часцей Чырвонай Арміі. На гэты раз неабходна было атрымаць і перагнаць 20 300 коней. Пастановай вызначыўся парадак перагону: *«Коні павінны пераганяцца вольным ходам, без прывязі да калёсаў і толькі па мяккім грунце да 30 км у суткі. Праз кожныя тры дні даваць аднадзённы адпачынак на добрых пашах, робячы ў гэты час пагалоўны агляд коней, расчыстку капытоў і каванне».*



**Чырвонаармейцы збіраюць нямецкае трафейнае абмундзіраванне і заадно скармліваюць коням нямецкія каравульныя боты з саламяных жгутоў.**

Аднак, як сведчаць дакументы, гэтыя патрабаванні часта не выконваліся. Упаўнаважаны Полацкага аблвыканкама Кузьменка 27 чэрвеня 1945 года тэлеграфуе з Каўнаса старшыні СНК БССР П.К. Панамарэнку: *«Нарады на атрыманне коней адсутнічаюць. Калгаснікі прадуктамі харчавання да гэтага часу не забяспечаны. Далей жыць немагчыма. Калгаснікі самавольна ад'язджаюць дамоў без коней. Просім вашага ўмяшання ў атрыманне коней і харчавання».*

З дакладной запіскі ад 5 верасня 1945 года начальніка ветупраўлення Пінскага абласнога зямельнага аддзела на імя намесніка наркама земляробства Шыёнка: *«Большасць коней у табунах рухаюцца ў вупражы, прычым, як правіла, калёсы нагружаныя рознымі рэчамі, не звязанымі з перагонам: веласіпеды, мясарубкі і г.д. Акрамя гэтага, у табунах едуць на гэтых жа калёсах рэпатрыяваныя з Германіі людзі. Усё гэта знясільвае сілы коней і прыводзіць іх да змардавання».*

А вось што паведамляў у справаздачы аб працы Індурскага ўваходнага пункта яго начальнік Пятровіч: *«Загадчык базыператрымкі і лячэння слабых і хворых коней Чыстап'янаў злоўжывае сваім становішчам. Адбірае коней, якія ачунялі, і перадае іх сялянам за магарыч, прадае коней па сваім выразшэнні, а грошы прапівае... Ёсць і такія выпадкі, калі адказныя работнікі табуноў прадавалі сваіх добрых коней сялянам. а бралі ў іх слабых ці хворых, якіх пасля пакідалі нам на вылечванне».*

Сярод коней мелі месца значныя страты па прычыне так званага «абязножвання», калі, праходзячы вялікія адлегласці па грунтовых дарогах некаванымі, коні не маглі далей перамяшчацца. У сувязі з гэтым 30 чэрвеня 1945 года намеснік наркама земляробства БССР Шыёнак у лісце на імя каменданта Беларуска-літоўскай ваеннай акругі просіць *«адпусціць за наяўны разлік або з абавязацельствам вяртання 1500 кг ковачных цвікоў для кавання коней».*

Аналагічная тэлеграма была пасланая ў Маскву начальніку тылу Чырвонай Арміі генералу А.В. Хрулёву з просьбай адпусціць для Беларусі тры тоны ковачных цвікоў.

12 кастрычніка 1945 года выйшла спецыяльная пастанова СНК БССР «Аб ходзе перагону коней, якія перадаюцца з часцей Чырвонай Арміі, і перадачы іх калгасам Віцебскай вобласці». Адзначалася, што кіраўніцтвам вобласці і непасрэднымі выканаўцамі па перагоне коней дапушчаныя сур'ёзныя памылкі, у выніку чаго падзеж коней склаў 25 % і крадзяжы 12 %. Старшыні Віцебскага аблвыканкама Ярмошанку была аб'яўлена вымова, супраць канкрэтных вінаватых у падзяжы і крадзяжы коней заведзена крымінальная справа.

У адказ на ліст упраўляючага Брэсцкай нарыхтоўчай жывёлаканторы аб бядотным становішчы калгаснікаў-гоншчыкаў, якія прыбылі атрымаць коней, СНК БССР тэлеграмай ад 25 кастрычніка 1945 года абавязаў старшыню Брэсцкага аблвыканкама тэрмінова выдзеліць Пружанскаму пункту па прыёмцы і перадачы коней 15 тон хлеба, 2 тоны мяса, 400 кг тлушчу, 400 кг цукру, 800 кг круп.

Нягледзячы на вялікія цяжкасці перагону, многія табуншчыкі даставілі коней да месца прызначэння ў добрым стане і без стратаў. Так, упаўнаважаны Бабруйскай вобласці Чарноў у зоне 3-га Беларускага фронту атрымаў 950 галоў коней, а ў вобласць даставіў 948 галоў — за ўсю дарогу згубіў толькі двух коней. Табуншчык Пятроў з гэтай жа вобласці атрымаў 120 коней і ўсіх без стратаў даставіў у раён.

Згодна з даведкай Наркамзема БССР, на 30 кастрычніка 1945 года з франтоў і ваенных акругаў у калгасы Беларускай ССР паступіла 49 509 коней. Аднак перагон на гэтым не скончыўся. У гэты ж дзень праводзіцца экстраннае пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б і выходзіць чарговая пастанова «Аб мерах па перагоне і размеркаванні коней, якіх атрымліваюць з Кёнігсбергскай асобай ваеннай акругі». На гэты раз неабходна было атрымаць 24 тысячы коней і даставіць іх у Мінскую, Віцебскую і Магілёўскую вобласці.

У сувязі з надыходам халадоў і адсутнасцю пашы трэба было шукаць фуражныя кармы. Таму пастанова СНК і ЦК КП(б)Б абавязвала Наркамзем БССР арганізаваць на трасах перагону зернефуражныя базы. На гэтыя мэты па разліках неабходна было даставіць на базы 2380 тон сена і 525 тон аўса.

Усе коні, якія перадаваліся ад вайсковых часцей, фарміраваліся ў эскадроны па 500 галоў і па вопісе здаваліся для перагону камандзіру эскадрона і прадстаўніку ад абласцей краіны. На кожны эскадрон штаб акругі выдзяляў 170 гоншчыкаў з ліку рэпатрыюемых, 11 чалавек узброенай аховы, 1 ветурача, 1 ветфельчара, 1 медыцынскага фельчара, 2 кавалёў і 35 параконных павозак. Людзі, занятыя перагонам, забяспечваліся прадуктамі харчавання з ваенных базаў па шляху руху.

У справаздачы старшага дзяржаўнага інспектара па конегадоўлі пры Наркамземе БССР Бандарэнкі «Аб стане конегадоўлі ў Беларускай ССР у 1945 годзе» падведзены вынікі перагону коней. Згодна са звесткамі справаздачы, у народную гаспадарку краіны ў 1945 годзе паступілі 83 737 трафейных і нявыкарыстаных Чырвонай Арміяй коней. Акрамя таго, страты склалі 10 340 коней. У забеспячэнні перагону ўзялі ўдзел 1089 калгаснікаў-гоншчыкаў, 182 кіруючых работнікі, 156 заветработнікаў і 177 іншых спецыялістаў.

25 снежня 1945 года ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб прадстаўленні да ўрадавай узнагароды калгаснікаў, спецыялістаў жывёлагадоўлі і работнікаў партыйных, савецкіх і зямельных органаў Беларусі, якія асабліва вызначыліся пры выкананні задання ўрада па перагоне жывёлы». Сярод узнагароджаных ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — член калгаса «Камінтэрн» Віцебскага раёна старшы гуртапраў Васільеў Андрэй Мітрафанавіч, заатэхнік Асвейскага раёна Полацкай вобласці Агурыцкі Пётр Міхайлавіч, ветурач Уздзенскага райза Мінскай вобласці Чакалін Леанід Вісарыёнавіч.

Ордэнам Чырвонай Зоркі ўзнагароджаны 12 чалавек. Сярод іх: Бар'яш Ганна Архіпаўна — старшая табуншчыца калгаса «Лесен» Акцябрскага раёна Бабруйскай вобласці. Пад яе кіраўніцтвам быў забяспечаны перагон у свой раён 100 коней без страт у дарозе.

Ордэнам Знак Пашаны ўзнагароджаны 13 чалавек. Гэтай узнагароды ўдастоены загадчык аддзела жывёлагадоўлі Бабруйскага абкама КП(б)Б Кандрацьеў Іван Тарасавіч за паспяховы перагон у калгасы вобласці 11 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы і 10 тысяч коней, член калгаса «Другая пяцігодка» Магілёўскага раёна Шагаў Ціхан Нікіфаравіч за забеспячэнне перагону ў раён 113 галоў буйной рагатай жывёлы на адлегласць 800 км.

Медалямі «За працоўную доблесць» і «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны яшчэ 25 чалавек.

Па выніках перагону коней Наркамзем БССР 26 сакавіка 1946 года выдаў загад, у якім адзначалася, што ў выніку паступлення трафейных і нявыкарыстаных Чырвонай Арміяй коней пагалоўе іх у калгасах павялічылася за 1945 год на 25 %. На прэміяванне ўдзельнікаў перагону, якія вызначыліся, было выдзелена 150 тысяч рублёў. З гэтай сумы абласным зямельным аддзелам выдзялялася 88 тысяч рублёў, якія, згодна з загадам, прызначаліся «для прэміявання і ліквідацыі дэбіторскай запазычанасці». Далей прэміявалася група адказных работнікаў на суму 33 700 рублёў і спецыялісты цэнтральнага апарата Наркамзема БССР у суме 28 300 рублёў.

Адным словам, тысячы калгаснікаў, якія непасрэдна ўзялі ўдзел у гэтым марафоне і адчулі на сабе ўсе цяжкасці шматдзённай знясільваючай працы, як відаць, былі абдзеленыя прэміяй, таму што аблземаддзелы, зразумела ж, з выдзеленых сродкаў на прэміі, перш за ўсё пагашалі запазычанасці за атрыманых калгасамі коней. У калгасаў грошай не было, і таму запазычанасць склала вялізныя сумы. Згодна з загадам Наркамата земляробства ад 3 студзеня 1946 года, толькі па Мінскай вобласці запазычанасць дзяржбюджэту склала больш за 15 мільёнаў рублёў. У Бабруйскай вобласці аплата спагнана толькі за 1100 галоў, у той час як паступіла 14 тысяч коней.

І толькі ў 1948 годзе Пастановай Савета Міністраў і ЦК КП(б)Б з калгасаў была спісана іх запазычанасць.

Перадача коней нашмат палепшыла баланс цяглавай сілы, стварыла магчымасць больш арганізавана правесці ўсе сельскагаспадарчыя работы.

Згодна са статыстыкай, у 1945 годзе трактарамі апрацавана 869 тысяч гектараў ворнай зямлі, або 29 %, а коньмі — 1949 тысяч гектараў, або 66,3 %. Коні ў гэты час былі на вагу золата.

**Генадзь БАРКУН, гісторык.**

**Футбол**

## БАТЭ зноў не прапускае, а «Дынама» выходзіць на другое месца

Адбыліся матчы 13-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе. БАТЭ зноў мінімальна перамагло (1:0), на гэты раз бабруйскую «Белшыну». Праўда, бабруйчане забілі сабе самі — на 6-й хвіліне аўтагол на свой рахунак запісаў абаронца ЮрыйÁstручык. Нагадаем, што на працягу 13-ці тураў барысаўскі клуб захоўвае свае вароты ў недатыкальнасці. «Сухая» серыя чэмпіянату складае 1170 мінут, а калі ўлічваць і мінулагодняе першынство, то 1348, або 22 гадзіны 28 хвілін.

На другое месца выйшла сталічнае «Дынама». У прынцыповым матчы з «Мінскам» «бела-блакітныя» пераважна абараняліся, нанеслі тры ўдары па варотах, два з якіх былі трапнымі. Яны на рахунку Антона Пуцілы. «Мінск», які атакаваў амаль увесь матч, пацярпеў крыўднае паражэнне (0:2). Так пступова ўсё становіцца на свае месцы — традыцыйныя лідары чэмпіянату БАТЭ і «Дынама» занялі верх турнірнай табліцы. Цяпер «Дынама» ад БАТЭ аддзяляе пяць ачкоў. «Мінск» і «Белшына» па-ранейшаму маюць па 23 ачкі. Адзінаццатае паражэнне ў чэмпіянаце пацярпеў «Партызан». На гэты раз з лікам 0:2 каманда саступіла «Шахцёру». А вось брэсцкія дынамаўцы пасля чатырох паражэнняў нарэшце атрымалі тры ачкі — у Жодзіна яны перамаглі тарпедаўцаў (1:0). Магілёўскі «Днепр» з лікам 2:1 выйграў у гродзенскага «Нёмана». Унічыю скончылася паўночнае дэрбі — у Наваполацку «Нафтан» і «Віцебск» згулялі з лікам 0:0.

Турнірнае становішча: БАТЭ — 31 ачко (розніца мячоў 18-0), «Дынама» Мн — 26 (22-9), «Белшына» — 23 (13-13), «Мінск» — 23 (21-11), «Шахцёр» — 21 (14-8), «Днепр» — 18 (15-23), «Дынама» Бр — 18 (17-14), «Віцебск» — 14 (13-17), «Нафтан» — 13 (10-11), «Нёман» — 11 (10-12), «Тарпеда» — 9 (15-22), «Партызан» — 2 (4-32).

Матчы наступнага тура адбудуцца ў нядзелю, 13 чэрвеня.

**Алена КРАВЕЦ.**

### САДАВІНУ І СУХАФРУКТЫ З ТАДЖЫКІСТАНА ВАРТА ПАДВЯРГАЦЬ СТАРАННАЙ АПРАЦОЎЦЫ

Санслужба Мінска нагадвае пра тое, што ў гэтай краіне зафіксавана ўспышка поліяміэліту. Па апошняй інфармацыі, дыягназ пацвердзіўся ў 150 чалавек.

— У Беларусі выпадкі поліяміэліту не фіксаваліся ўжо некалькі гадоў, — паведаміла карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» ўрач-эмідэміёлаг Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ленінскага раёна Аксана Баяркіна. — У нас усім дзецям робяць прышчэпку ад поліяміэліту.

Зрэшты, тым, хто збіраецца ў Таджыкістан, урачы рэкамендуюць рабіць яшчэ адну прышчэпку — монавалентнай вакцынай, якая прымяняецца ва ўмовах эпідэмічнай успышкі. У мэтах прафілактыкі таксама варта больш старанна мыць садавіну і сухафрукты, завезеныя з Таджыкістана. Поліяміэліт — вострае віруснае захворванне, якое характарызуецца пашкоджаннем нервовай сістэмы, а таксама запаленчымі змяненнямі слізістай абалонкі кішэчніка і насаглоткі. Яно можа прывесці да паралічу.

**Вікторыя МІХНЮК,** *«Мінск—Навіны».*

**Рэверс з сеціва**

# ВАЙСКОВЫЯ БОТЫ ЦІ ХАЛАТ САНІТАРА?

**(3 чэрвеня 2010 года)**

## *У Беларусі ідзе абмеркаванне закона аб альтэрнатыўнай грамадзянскай службе*

**Неўзабаве ў беларускіх хлопцаў з'явіцца альтэрнатыва арміі — грамадзянская служба. І тым, хто па нейкіх прычынах не хоча абараняць Радзіму са зброяй, будзе прапанавана паслужыць ёй у шпіталях, дамах састарэлых ці лясгасах. Па словах удзельнікаў міжнароднай канферэнцыі «Грамадзянская служба ў краінах Еўропы і рэгіёне СНД: гісторыя, мадэлі, стандарты. Перспектывы развіцця грамадзянскай службы ў Беларусі», у нас ёсць унікальны шанц пазбегнуць памылак краін, дзе альтэрнатыўная служба існуе досыць працяглы час.**

**Настасся ЗАНЬКО.**

@

Калі закон па АГС будзе працаваць, то гэта карэнным чынам зменіць адносіны чалавека і дзяржавы ў сённяшняй Беларусі. Чалавек будзе сам выбіраць, як ён можа быць карысным сваёй краіне.

**Trickser.**

@

Добрая, карысная справа.

**МАЦКЕВІЧ Уладзімір.**

@

Думаю, альтэрнатыўная служба сапраўды патрэбна Беларусі. Часта можна пачуць гісторыі, як салдацікі «малююць траву» ці па-іншаму марнуюць час, бо іх трэба нечым заняць. Праз гэта многія хаваюцца ад арміі, і ў той жа час не супраць аддаць абавязак Радзіме, але ў больш карысным варыянце. Ад наяўнасці альтэрнатыўнай службы выйграюць усе. Ці гэта не так? Сацыяльныя інстытуцыі атрымаюць неабходны персанал, ваеннае ведамства пачне расходаваць менш сродкаў, прызыўнікі (некаторыя) з большай верай пачнуць аддаваць абавязак і г. д. Я за альтэрнатыўную.

**NIra.**

@

Вялікі дзякуй за тое, што размясцілі цікавы артыкул! Альтэрнатыўная служба створыць новыя магчымасці для Беларусі і яе грамадзян... Таму няхай гэтая справа жыве і развіваецца.

**Георгій ПЛАШЧЫНСКІ.**

@

А чаму ўвогуле склалася такая дзіўная сітуацыя? У Канстытуцыі права на альтэрнатыўную службу прапісанае, а закона ўсё не было.

**Юрый ЧАВУСАЎ.**

@

Дзякуй за артыкул і канферэнцыю! Я вельмі спадзяюся, што ў Беларусі будзе нарэшце прыняты закон аб АГС, які будзе базавацца на еўрапейскіх прататыпах. Упэўнены, што пры наяўнасці пэўнага жадання і розуму такі закон зможа ўлічваць найлепшым чынам як інтарэсы арміі і дзяржавы, так і грамадзян.

**Улад ВЯЛІЧКА.**

@

Асабіста я спадзяюся, што ўсё ж прыслухаюцца да рэкамендацый грамадскіх ініцыятыў. Тым болей, калі ідуць, сапраўды, слушныя прапановы. Таму што праца з трэцім сектарам ідзе настолькі марудна: часам падаецца, што яна лёдам пакрылася... А тут варта па-іншаму...

**Настасся ЗАНЬКО.**

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

@

А вось вы скажыце, навошта гэтае блюзнерства з альтэрнатыўнай службай? Што гэта за служба такая — у шпіталі? Я вось у арміі адслужыў, дык магу і за Радзіму пастаяць, калі што. А што тыя санітары зробяць, га? Што зробяць леснікі ў выпадку вайны? Іх жа адразу перастраляюць. Той, хто не хоча служыць са зброяй, хай ідзе сабе на салдацкую кухню кашу варыць. Спакон вякоў так было, што жанчыны нараджалі дзяцей, а мужчыны ішлі ў армію.

**Ваяка.**

@

Цяпер галоўнае — з'яўленне адэкватнага закона. І без удзелу грамадскасці там не абысціся. Шкада, што ў працоўную групу пакуль не ўключылі прадстаўнікоў кампаніі за АГС...

**Віталь НІКАНОВІЧ.**

@

Ваяка, не смяшы. Я таксама служыў... З таго даўняга года, што я правёў у арміі, на сапраўды ваенную падрыхтоўку пайшло самае большае 2-3 месяцы. А ўвесь астатні час мы займаліся незразумела чым, толькі каб час правесці. Дык гэта была мабільная часць. А мой аднакласнік, які служыў у немабільнай часці, за паўтара года аўтамат толькі тры разы трымаў у руках. А ўвесь астатні час — рыдлёўку. Толькі і навучыліся, што на парадах прыгожа маршыраваць. Лепш ужо няхай той... сапраўды ідзе на альтэрнатыўку і на самай справе робіць што-небудзь карыснае для краіны...

**Назіральнік.**

@

Назіральнік, вы лічыце, што альтэрнатыўка — годная замена арміі? А як жа хлапец стане мужчынам без арміі? Мне, напрыклад, падаецца, што кожны хлапец павінен прайсці гэтую службу. Каб загартавацца і быць псіхалагічна гатовым да ўсяго. А то што ў альтэрнатыўцы, ніякіх такіх табе выпрабаванняў і абмежаванняў.

**Ваяка.**

@

Ваяка, ёсць відавочныя стэрэатыпы адносна альтэрнатыўнай службы і службы ў арміі. І ўсім ім прычына — няведанне. Я на працягу дзесяці гадоў працую з нямецкімі альтэрнатыўшчыкамі і ведаю, з якімі сітуацыямі яны сутыкаюцца. Напрыклад — догляд смяротна хворага чалавека. Калі малады чалавек на працягу некалькіх месяцаў знаходзіцца з ім побач, разумее яго погляды на жыццё, перажывае з ім цяжкія моманты. Гэта сапраўды выхоўвае ў чалавеку дарослыя якасці. АГС — гэта не супраць арміі, АГС — гэта альтэрнатыва. Паспрабуйце зразумець гэтую пазіцыю.

**Trickser.**

@

Не ўсе людзі аднолькавыя. Адны любяць спорт, другія — музыку. Адны атрымліваюць задавальненне ад фізічнай працы, другія ўсяго сябе аддаюць творчасці. І на мой погляд, АГС — гэта яшчэ і магчымасць усім маладым людзям аддаць абавязак Радзіме... І лішні раз зразумець, што ён таксама можа зрабіць штосьці патрэбнае. Ён не горшы.

**Васіль.**

Краіна здароўя
Выпуск
№ 23 (192)

# Аздараўленне дзяцей залежыць ад іх узросту

**НАСТАЎ час адпачынкаў. А значыць — напярэдадзе падарожжы на далёкія курорты і блізкія дачы. Разам з бацькамі на аздараўленне паедуць і дзеці. Якія мясціны лепш за ўсё выбраць для адпачынку з імі? І што трэба для таго, каб хлопчыкі і дзяўчаткі вярнуліся дадому папрыгажэлымі і паздаравелымі? Пра гэта нам расказала прарэктар па лячэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, дацэнт, галоўны пазаштатны дзіцячы інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя Іна ГЕРМАНЕНКА.**

Мора, паўднёвыя пляжы — гэта заўсёды заманліва. Аздараўленне тут рэкамендуецца дзецям, у якіх праблемы са скурай, органамі дыхання, якія маюць сардэчна-сасудзістыя захворванні і хваробы суставаў. Аднак трэба ўлічваць, што аздараўленне дзяцей залежыць ад іх узросту, малым да пяці гадоў пажадана аздараўляцца ў той зоне, дзе яны нарадзіліся і жывуць. Больш старэйшыя хлопчыкі і дзяўчаткі могуць выязджаць за межы краіны. Пры гэтым важна ведаць, што вывозіць дзяцей на адпачынак пажадана ў пачатку лета, асабліва ў краіны са спякотным кліматам. Гэта трэба для таго, каб, калі яны вернуцца, у нас яшчэ было лета. Аздараўленне ў жніўні, у аксамітавы сезон, для дзяцей не заўсёды падыходзіць. Можа здарыцца так, што яны вернуцца ў наш халодны верасень. Тут і падпільнуюць іх прастуды і абвастрэнні іншых хваробаў. І эфект ад аздараўлення будзе адваротным.

Важна памятаць, што адпачынак за межамі краіны павінен працягвацца не менш за 3-4 тыдні. Сутнасць у тым, што перыяд адаптацыі і ў нашай кліматычнай зоне цягнецца 7—10 дзён. І чым меншае дзіця, тым ён даўжэйшы, а калі ў вас пуцёўка на два тыдні, то на нармальны, паўнацэнны адпачынак і аздараўленне дзецям застаецца ўсяго нічога. Яшчэ. З сонцам трэба быць на «вы», асабліва на поўдні. Прыём сонечных ваннаў у дзяцей павінен абмяжоўвацца раніцай да 11-12 гадзін і ў другой палове дня пасля 15-16 гадзін, калі самая малая інсаляцыя.

Вядома, што добрымі ўласцівасцямі валодаюць і розныя водныя працэдуры. Гаючыя якасці мора ніхто не адмяняў. Але важна прытрымлівацца пэўных правілаў. Сачыць за тым, каб дзіця было актыўным у вадзе, не пераахалоджвалася, пасля купання яго трэба выцерці і змяніць бялізну на сухую.

Адпачынак у родных мясцінах — таксама добры варыянт для аздараўлення дзяцей. Тут прывычная кліматычная зона, тэмпературны рэжым. Успомніце, якія ў нас цудоўныя сасновыя бары, бярозавыя гаі. Чыстае паветра, напоўненае эфірным алеем, вельмі падыдзе для аздараўлення дзяцей з паталогіяй органаў дыхання.

Лепш аздараўляцца дома і дзецям з шэрагам хранічных хваробаў. Напрыклад, з герпетычнай інфекцыяй, рэцыдывамі інфекцыйнага монануклёзу, гепатытамі, некаторымі хваробамі скуры. Для іх залішняя інсаляцыя непажаданая. Бо на фоне яе асобныя інфекцыйныя вірусныя агенты могуць справакаваць развіццё іншых хваробаў: гематалагічных, анкалагічных і г. д.

Чаго трэба асцерагацца падчас адпачынку і аздараўлення? Перш за ўсё трэба быць вельмі асцярожным з вадой. Водныя крыніцы ў мясцінах, дзе вы адпачываеце, павінны быць чыстымі. Напрыклад, у нас у Беларусі некаторыя дачныя пасёлкі, дзе добрае, свежае паветра, не забяспечаны чыстай вадой. Таму тую ваду, якая выкарыстоўваецца ў розных мэтах, абавязкова трэба апрацоўваць, каб пазбегнуць кішэчных інфекцый.

Выязджаючы за межы нашай краіны, трэба ведаць, што ў тых жа Турцыі, Егіпце, Крыме, Адэсе нават водаправодная вада не заўсёды бывае якаснай. Яе неабходна кіпяціць, але лепш выкарыстоўваць бутляваную пітную ваду.

Цяпер аб прадуктах харчавання. Неабходна абавязкова сачыць за тэрмінамі прыдатнасці іх выкарыстання. Асабліва гэта датычыцца малочных прадуктаў. Напрыклад, вы бачыце на ярлычку, што тэрмін прыдатнасці ёгурту яшчэ тыдзень, а слоік уздуты, значыць, недзе парушаліся тэрміны захоўвання. Месца такому ласунку — на сметніку. Бо ў прадукце часта размнажаюцца хваробатворныя мікробы, якія потым могуць выклікаць розныя кішэчныя інфекцыі.

Яшчэ адна праблема. Не толькі ў нас, але і ў суседніх краінах небяспечнымі з'яўляюцца кляшчы. Гэтыя насякомыя могуць быць крыніцай інфекцый: хваробы Лайма, вірусу клешчавага энцэфаліту, якія рэгіструюцца на тэрыторыі нашай краіны. Для прафілактыкі клешчавага энцэфаліту можна зрабіць прышчэпку. А вось ад хваробы Лайма вакцын у нас пакуль няма. Таму трэба прыняць засцерагальныя меры самім. На прагулках адзенне павінна быць шчыльным, абавязковы галаўны ўбор. Пасля вяртання з лесу неабходна правесці знешні агляд усіх, хто быў там. Калі вы знайшлі кляшча, яго трэба зняць. І пажадана даставіць у найбліжэйшы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі для даследавання на інфіцыраванасць, каб ведаць, якія лячэбныя мерапрыемствы праводзіць з пацярпелым.

Пацярпець ад кляшчоў можна не толькі непасрэдна з імі пакантактаваўшы. Бывае, што дзяцей аздараўляюць з дапамогай казінага малака. Аднак калі козы былі пакусаныя інфіцыраванымі кляшчамі, то праз малако можна заразіцца вірусам клешчавага энцэфаліту. І пасля разаўецца клініка запалення мозгу. Гэта можа быць настолькі цяжкая форма, што прывядзе да лятальнага зыходу.

Даволі частая непрыемнасць на адпачынку — пераграванне, якое можа скончыцца цеплавым ці сонечным ударам. Іх прыкметы: санлівасць, у дзіцяці павышаецца тэмпература, нярэдка бываюць ваніты. Зрабіце прафілактычныя захады. У самую спякоту дзіця не павінна выходзіць за межы памяшкання, на сонцы абавязкова трэба насіць галаўны ўбор.

Выязджаючы за мяжу, варта даведацца ва ўрача-інфекцыяніста, па якіх інфекцыях у дадзеным месцы адпачынку неспрыяльная сітуацыя і як гэту інфекцыю можна папярэдзіць. Напрыклад, ад таго ж клешчавага энцэфаліту можна зрабіць прышчэпку перад ад'ездам. Збіраючы дзіця ў падарожжа, падрыхтуйце яму шапачку ад сонца і шчыльнае адзенне, зручны абутак.

А ў аптэчку трэба пакласці перш за ўсё прэпараты, якія зніжаюць тэмпературу, напрыклад, парацэтамол. Пажадана ўзяць лекі, якія дапамагаюць змагацца з кішэчнымі інфекцыямі ці харчовымі атручэннямі (рэгідрон, гастравіт, актываваны вугаль, смекту).

У краіны, дзе адзначаецца высокі паказчык кішэчных інфекцый, трэба ўзяць з сабой прэпарат, які прасаніруе кішэчнік ад асноўных кішэчных узбуджальнікаў — ніфураксазід.

Нярэдка небяспечнымі з'яўляюцца ўкусы розных насякомых. Супраць іх вазьміце прэпараты, якія здымаюць алергічную рэакцыю на ўкус: супрасцін, тавегіл, паратадзін, цэцірызін. Ад пакусаў насякомых можа дапамагчы феніcціл-гель. У аптэчцы павінны быць марлевыя тампоны і пластыр на выпадак нейкай траўмы, перакіс вадароду або таблеткі гідраперыту, ёд, зялёнка.

І шчаслівага, здаровага адпачынку вам і вашым дзецям.

**Вольга ШАЎКО.**

Жаночыя сакрэты

## КРЭМ І МЫЛА — НЕ ДЛЯ ЛЕТА

**Якія карэктывы патрэбна ўнесці ў догляд скуры ў спякотную пару? Вось што раяць касметолагі...**

**Як выбраць дзённы крэм на лета?**

Летні дзённы сродак для скуры твару павінен быць не крэмападобным, а ў выглядзе гелю. Кансістэнцыя крэму для спякотнай пары крыху густаватая, цяжкаватая — таму гэты сродак можа выклікаць адчуванне плёнкі на скуры твару. А гель мае лёгкую, далікатную тэкстуру, хутка ўсмоктваецца і не прычыняе летам ніякага дыскамфорту. Але гэта пры ўмове, што гель выбраны правільна — у адпаведнасці з парой года. Летам скура перш за ўсё мае патрэбу ў інтэнсіўным увільгатненні і добрай ахове ад ультрафіялету. Таму на дзённы гель ускладаюцца два абавязкі — ён павінен цудоўна ўвільгатняць і мець SPF не менш за 12.

Як і любы касметычны прэпарат, дзённы ўвільгатняльны гель трэба падбіраць па тыпу скуры. Але не спяшайцеся набываць любы гель — толькі б ён быў прызначаны для скуры вашага тыпу. Звярніце ўвагу на склад прэпарату. Уладальніцам тлустай скуры падыдзе гель, які ўтрымлівае экстракт алоэ або мачавіну — гэтыя рэчывы цудоўна ўвільгатняюць, не «нагружаючы» скуру. А калі ў гелі прысутнічаюць яшчэ і выцяжкі з рамонку, календулы або іншых траў, што аказваюць бактэрыцыднае дзеянне, — проста выдатна.

Для скуры, схільнай да сухасці, падыдзе гель з магутным увільгатняльнікам — гіялуронавай кіслатой.

Але аднаму дзённаму гелю не «напаіць» скуру ўдосталь. А калі яна будзе недастаткова ўвільготненай, то які б дзённы сродак вы ні выкарыстоўвалі, адчуванне сцягнутасці, сухасці і іншы дыскамфорт не выключаны. Таму летам смела выкарыстоўвайце ўвільгатняльныя маскі, ампулы з калагенам, эласцінам або хітазанам.

**Прэпараты, якія добра здымалі сальны бляск зімой, у спякоту ўжо не дапамагаюць. Што зрабіць, каб скура твару летам выглядала матавай, свежай?**

Сапраўды, сальныя залозы летам працуюць ва ўзмоцненым рэжыме — такім чынам арганізм спрабуе засцерагчы скуру ад сонечных прамянёў. Справіцца з неэстэтычным бляскам можна адным спосабам — у гарачыню тлустую скуру неабходна ачышчаць часцей, чым у любую іншую пару года. Гэта значыць умывацца і прымяняць тонік варта не толькі вечарам, але і раніцай, і ў сярэдзіне дня. Тым самым вы своечасова будзеце выдаляць лішак скурнага сала і папярэдзіце з'яўленне на твары непрыгожага бляску. Умывацца трэба спецыяльна прызначаным для тлустай скуры гелем або пенкай. І ніякага мыла — летам як ніколі шчолач узмацняе салааддзяленне. «Летні» тонік або ласьён павінен валодаць дэзынфікуючымі ўласцівасцямі. Такі прэпарат не толькі ліквідуе залішні бляск, але і папярэдзіць з'яўленне запаленняў — нярэдкіх «гасцей» тлустай скуры ў спякоту. Добра прадухіляюць прышчы і пачырваненне ласьёны або тонікі з малочнай, гліколевай або саліцылавай кіслотамі. «Узрадуецца» скура і прэпарату, у якім ёсць календула, алей чайнага дрэва, рамонак. А вось ад крэмаў і эмульсій, якія закліканы адсарбаваць скурнае сала і рабіць скуру матавай, у летні час лепш адмовіцца. Гэтыя сродкі ўтвараюць на скуры даволі шчыльную плёнку, якая закупорвае поры, — а гэта ў гарачыню можа прывесці да з'яўлення прышчоў.

**У спякоту добра асвяжае скуру мінеральны спрэй. Але, магчыма, ён мае іншае прызначэнне?**

Асноўны абавязак касметычнага спрэя — паверхневае ўвільгатненне скуры. А таму летам такі сродак — рэч незаменная. Бо актыўнае сонца забірае ў скуры шмат вільгаці.

Выкарыстоўваецца спрэй як дадатак да асноўных увільгатняльных сродкаў — дзённага крэму, касметычнай маскі. Прычым спрэй можна прымяняць на працягу дня столькі разоў, колькі захочацца. Можна распыляць увільгатняльнае воблачка і проста на касметыку. Праўда, тут ёсць адно «але». Калі вы ўвесь дзень знаходзіцеся ў памяшканні — пасля выкарыстання спрэя прамакніце твар сурвэткай, і макіяж застанецца бездакорным. А вось калі вы правялі нейкі час на вуліцы, то лепш спрэй на касметыку не распыляць. Бо мікрапырскі змяшаюцца з вулічнымі пылінкамі, якія аселі на вашым твары, і зробяць макіяж неахайным. Ды і скуры такая пыльна-касметычная плёнка на карысць не пойдзе.

**Якая з пудраў — рассыпістая, вадкая або кампактная — летам будзе выглядаць больш эстэтычна і скуры не нашкодзіць?**

У летнюю пару лепш выкарыстоўваць вадкія танальныя сродкі. Яны роўна размяркоўваюцца па скуры, не ўтвараючы пры гэтым плёнку, якая закупорвае поры. Для нармальнай і сухой скуры лепш выбіраць танальныя крэмы. А для тлустай скуры тон oil free (гэта значыць, які не ўтрымлівае тлушчавых кампанентаў). Такія сродкі яшчэ называюць танальнымі эмульсіямі.

І яшчэ: калі на вуліцы пахмурна і халаднавата, падыдзе асенне-зімовы тон — з фактарам аховы ад ультрафіялету 4. А ў сонечныя летнія дні спатрэбіцца танальны сродак з даволі высокім SPF — не менш за 12. Што ж датычыцца 30-градуснай спякоты, то ў такое надвор'е ад танальнага крэму лепш увогуле адмовіцца, бо павышаецца пота- і салааддзяленне. Карацей, макіяж, які «паплыў», яшчэ нікога не ўпрыгожваў. Ды і запаленні могуць з'явіцца. Лепш пры такім «афрыканскім» клімаце абыходзіцца дзённым крэмам з сонцаахоўным фільтрам.

**Летам сродкі з фруктовымі кіслотамі не рэкамендуецца выкарыстоўваць. А чым іх можна замяніць?**

Прэпараты, у склад якіх уваходзяць фруктовыя кіслоты, адлушчваюць паверхневыя клеткі і ўвільгатняюць скуру. За кошт гэтага яна набывае прыгожае адценне, становіцца роўнай, аксамітнай. Але вызваленая ад адмерлых клетак, скура становіцца адчувальнай да актыўных сонечных прамянёў — на ёй пад дзеяннем моцнага летняга ўльтрафіялету могуць з'явіцца пігментныя плямы. А пазбавіцца ад пігментацыі вельмі нялёгка. Таму лепш не рызыкаваць і адкласці сродкі з фруктовымі кіслотамі да восені. Але не спяшайцеся засмучацца. Падмацаваць дзеянне «нізкакіслотных» прэпаратаў дапамогуць летнія дары прыроды. Маскі з клубніц, малін, чорных парэчак таксама цудоўна ўвільгатняюць скуру, дораць ёй свежасць. Іх варта наносіць 2-3 разы на тыдзень.

**На твары, руках, спіне летам з'яўляецца рабаціннe. Для твару сродкаў з SPF-фільтрам мноства, а чым жа засцерагчы скуру цела?**

Найлепшая ахова ад сонца для скуры, схільнай да з'яўлення рабаціння, — гэта адзенне. Але не будзеш жа апранацца ў гарачыню ў блузку з доўгім рукавом і глухім каўнярам. Таму ў такія дні на адкрытыя ўчасткі цела можна наносіць сонцаахоўны сродак для твару. Выратуе ад пігментацыі і сродак для загару, які вы выкарыстоўваеце на пляжы. Толькі для штодзённага прымянення лепш выбіраць не малачко або масла для загару, а гель. Няцяжка знайсці сродак, спецыяльна прызначаны для штодзённай аховы скуры цела ад сонца, сярод прафесійных прэпаратаў. Аднак які б прэпарат вы ні выбралі, улічыце: скуру, схільную да пігментацыі, зможа як належыць засцерагчы ад сонца толькі сродак з SPF 12 і вышэй. Калі ж вы едзеце на адпачынак у гарачыя краіны, то там штодзень перад выхадам на вуліцу наносьце на скуру цела і твару сродак з SPF 20.

**Як правільна карыстацца сонцаахоўным крэмам?**

- Наносьце яго на скуру за 30 хвілін да выхаду на сонца.
- Паўторна наносьце крэм кожныя 2 гадзіны на працягу ўсяго часу знаходжання пад сонцам.
- Калі вы купаецеся або моцна пацееце, паўторна наносьце крэм праз кожныя 40 хвілін, а калі крэм водаўстойлівы — праз кожныя 90 хвілін.
- Старанна наносьце крэм. Не забудзьцеся пра нос, тыльны бок рук, верхнюю частку галёнкі пад каленам, пад'ём ступняў і верхнюю частку вуха. Каб нічога не прапусціць, скарыстайце люстэрка.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ЛЯСНОЕ ЛЮСТЭРКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «КАНДЫЦЫЯНЕРНЫ» НАСМАРК — ОФІСНАЯ ХВАРОБА?

**Як ні дзіўна, але факт: летам жыхары мегаполісаў хварэюць не радзей, чым зімой. Асабліва часта ад прастуды церпяць офісныя работнікі. Ёсць меркаванне, што прычынай летніх «эпідэмій» з'яўляюцца офісныя кандыцыянеры...**

Вось некалькі самых распаўсюджаных абвінавачанняў у адрас кандыцыянера:

**1. Бактэрыі-забойцы.**

Апошнім часам часта можна пачуць пра тое, што ў кандыцыянеры «жывуць» бактэрыі legionella — крыніца так званай «хваробы легіянераў» (легіянэлёзу). Сапраўды, такія бактэрыі існуюць, як існуе і такое захворванне, прычым насмарк — зусім не самая сур'ёзная яе праява. Усе можа завяршыцца нават лятальным зыходам...

«Захворванне легіянераў» атрымала сваю назву ў гонар успышкі захворвання ў перыяд работы 58-га штогадовага кангрэсу амерыканскага легіёна, які праходзіў у Філадэльфіі ў ліпені 1976 года. Вось толькі гэта бактэрыя вельмі «паважае» водную завісь, прагрэтую прыкладна да плюс 30 градусаў. А ў бытавых кандыцыянерах тэмпература кандэнсату крыху большая за нуль градусаў, прычым ён тут жа выдаляецца. Менавіта таму ў свеце не зафіксавана ні аднаго выпадку заражэння легіянелёзам ад спліт-сістэм і бытавых кандыцыянераў.

**2. Канцэнтрацыя вірусаў.**

Часта можна пачуць, што кандыцыянер — сапраўдная крыніца вірусаў. У сувязі з гэтым прыгадваюцца і атыповая пнеўманія, і грып, і ВРВІ. На самай справе адзінае, у чым можна абвінаваціць гэты электрапрыбор, дык гэта ў «перамешванні» вірусаў у памяшканні. Але ў адрозненне ад вентылятара кандыцыянер прапускае паветра праз сістэму фільтраў, чым спрыяе знішчэнню бактэрый, якія могуць прысутнічаць у паветры.

**3. Каварны скразняк.**

Кожны, хто сядзеў на скразняку, ведае, што гэта самы верны спосаб падхапіць насмарк, кашаль ці ангіну. У выпадку з кандыцыянерам такое няшчасце і сапраўды можа адбыцца, але толькі ў тым выпадку, калі ён няправільна ўсталяваны ці не адрэгуляваны. Па правілах паветраны паток павінен быць накіраваны ўздоўж столі, каб забяспечыць перанос ахаладжальнага паветра. Ён больш цяжкі, чым цёплае паветра, і праз нейкі час сам спусціцца ўніз. Дык чаму ж узнікае «кандыцыянерны» насмарк? Калі паток ледзянога паветра паступае неперарыўна, нос не паспявае рэагаваць, пераахалоджваецца, яго слізістыя абалонкі запаляюцца, і ў выніку нос пачынае хлюпаць. Тое ж самае адбываецца і пры рэзкім перападзе тэмператур, таму **каб не захварэць у памяшканні, дзе ўсталяваны кандыцыянер, трэба прытрымлівацца наступных немудрагелістых правілаў:**

— Нават калі вы прыйшлі са спякоты і хочаце хутчэй ахаладзіцца — не спяшайцеся! Не трэба паддавацца спакусе настроіць кандыцыянер на больш нізкую тэмпературу. ***Бяспечны для здароўя хуткі перапад тэмператур складае не больш як 3-5 градусаў, таму калі вы ўвайшлі з вуліцы, дзе было плюс 30 градусаў, у памяшканне, то лепш выбраць тэмпературу плюс 23-24 градусы і толькі праз пару гадзін можна паступова знізіць тэмпературу да 20-22 градусаў.***

— Карыстайцеся таймерам, каб да вашага прыходу кандыцыянер самастойна паспеў ахаладзіць паветра ў памяшканні.

— Не ўстанаўлівайце моцны рэжым абдуву.

— Рэгулярна прамывайце ці мяняйце фільтры.

— Імкніцеся ніколі на знаходзіцца пад прамым патокам паветра з кандыцыянера.

— Перш чым набыць і ўсталяваць кандыцыянер, абавязкова пракансультуйцеся з прафесіяналамі і не саромейцеся ім задаваць пытанні аб уласнай бяспецы. Выбірайце толькі якасную тэхніку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Санслужба Мінска выступае за антытытунёвыя прыпынкі грамадскага транспарту

У Мінску неабходна павялічыць колькасць зон некурэння, аб'явіўшы такімі прыпынкі грамадскага транспарту. Пра гэта паведаміў кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, галоўны санітарны ўрач горада Фёдар Германовіч на апаратыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«З прадпрыемствам «Гаррэмаўтадор» мы дамовіліся, што на прыпынках павінны быць вывешаны знакі аб забароне на курэнне. Дарожнікі часткова зрабілі гэта», — сказаў Фёдар Германовіч. Паводле яго слоў, насельніцтва станоўча рэагуе на ініцыятыву санслужбы. «Гэта ідэя правільная, яе неабходна працягнуць і завяршыць», — падкрэсліў галоўны санітарны ўрач горада.

У гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА Фёдар Германовіч патлумачыў, што ўстаноўка знакаў аб забароне на курэнне на прыпынках — гэта не забаронная мера, а толькі рэкамендацыя, да якой санслужба заклікае гараджан прыслухацца. Тым самым у Мінску павялічыцца колькасць зон некурэння.

## ФАСТ-ФУДУ — ФУ!

**Па меркаванні спецыялістаў, звыклы для сучаснага еўрапейца фаст-фуд небяспечны не толькі для чалавека, але і для сабак, якія жывуць у яго доме. Хатнія гадаванцы, як вядома, з вялікім энтузіязмам пераймаюць усе паводзіны свайго гаспадара, у тым ліку і яго харчовыя звычкі. Аднак чалавечая ежа можа быць для іх смяротна небяспечнай...**

Агульнавядома, што многія сабакі, якія жывуць у сем'ях еўрапейцаў і амерыканцаў, таксама як і іх гаспадары, церпяць ад атлусцення. Больш за тое, сабакі буйных парод нярэдка церпяць ад захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы з-за сваёй залішняй вагі. Але пры гэтым многія ўладальнікі сабак і катоў нават не падазраюць, што смачны гамбургер можа стаць прычынай інфаркту і смерці іх хатняга любімца.

Бельгійскія даследчыкі, якія вывучалі прычыны смерці больш як 600 хатніх жывёлін, прыйшлі да высновы, што прычынай іх гібелі стала няправільнае харчаванне. Фаст-фуд аказвае на арганізм хатніх жывёлін яшчэ больш шкоднае ўздзеянне, чым на арганізм чалавека. Да таго ж, па прычыне больш кароткай працягласці жыцця нашых чатырохногіх сяброў, вынікі няправільнага харчавання праяўляюцца ў іх больш хутка, чым у чалавека. І калі чалавек можа прымусіць сябе сесці на дыету, то ні сабака, ні кот не зразумеюць, чаму гаспадар стаў такім жорсткім і больш не прапаноўвае яму «смачненькае»...

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВА УКРАІНЕ АЎТОБУСАМ ЗАБАРОНЯЦЬ ЕЗДЗІЦЬ ПАСЛЯ 22.00

**Міністэрства транспарту і сувязі падрыхтавала загад аб забароне перамяшчэння пасажырскіх аўтобусаў з 22.00 да 5.00 гадз. па ўсёй тэрыторыі Украіны. Пра гэта паведамляе proUA са спасылкай на прэс-службу ДАІ МУС Украіны.**

Як адзначаецца, такое рашэнне звязана з актывізацыяй у летні адпускны перыяд перавозак пасажыраў. Такім чынам, ездзіць у цёмны час сутак дазваляецца толькі транспартным сродкам, якія афіцыйна працуюць на рэгулярных рэйсавых маршрутах і абсталяваны тахографамі (бартавымі самапісцамі). Акрамя таго, у паўднёвых абласцях Украіны з ліку работнікаў ДАІ і транспартнай інспекцыі ствараюцца аўтамабільныя групы, якія будуць не толькі выяўляць нелегальных перавозчыкаў, але і кантраляваць выкананне легальнымі перавозчыкамі правілаў дарожнага руху і бяспечнай перавозкі пасажыраў.

Здароўе нацыі

## ТЭСТ НА ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД АЛКАГОЛЮ

**Гэты апытальнік распрацаваны спецыяльна, каб дапамагчы канкрэтнаму чалавеку зразумець і ўсвядоміць развіццё сімптомаў хімічнай залежнасці ад яе пачатку да позняй стадыі. Мэта апытальніка — не напалохаць, а праінфармаваць. Уключаныя сюды характэрныя сімптомы, аднесеныя да кожнай стадыі залежнасці, дазваляюць падрабязна разгледзець прыроду і прагрэсію хваробы з пазіцыі жыццёвай практыкі канкрэтнай асобы.**

**Адказваць трэба як мага больш праўдзіва. Калі хочацца адказаць «часам», трэба пазначаць «так». Некаторыя пытанні фактычна ўключаюць у сябе некалькі пытанняў, таму калі адказваеш «так» хоць бы на адно з гэтых пытанняў, трэба лічыць, што адказ «так» адносіцца да ўсяго пытання.**

1. Ці з'яўляюцца вашы блізкія сваякі — дзядулі, бабулі, бацькі, браты, сёстры алкаголікамі і наркаманамі?

2. Ці п'яце вы, як правіла, больш за сваіх сяброў? Ці часта вы адным з апошніх пакідаеце бар або вечарынку? Ці лічаць вас вялікім аматарам вечарынак?

3. Ці прыносіць вам задавальненне выпіўка і нецярплівае чаканне падыходнага моманту?

4. Ці даводзілася вам лавіць сябе на думцы, што вы не хочаце спыняць піць пасля 1-2 чарак, хоць іншым гэтага было дастаткова?

5. Ці адбываліся якія-небудзь змены ў характары вашага ўжывання алкаголю — пілі больш часта, пілі ў адзіночку або пераключаліся на больш моцныя напоі?

6. Ці праяўлялі неспакой або незадаволенасць з прычыны вашага ўжывання алкаголю блізкія вам людзі — бацькі, партнёр па шлюбе, дзеці?

7. Ці раздражняюць вас думкі пра безалкагольныя мерапрыемствы — вянчанні ў царкве, гасцях з безалкагольнымі напоямі і інш.?

8. Ці раздражняла вас калі-небудзь, што некаторыя з вашых сяброў п'юць надта павольна або спыняюць піць, хоць вечарынка яшчэ не скончылася? Ці прапаноўвалі вы выпіць сябрам, спрабуючы «падтрымаць» вечар?

9. Ці імкняцеся вы залпам выпіць першыя чаркі і потым, калі адчулі эфект, запавольваць тэмп да ўзроўню іншых?

**Колькасць адказаў «так» на пытанні з 1 па 9 __ х 1 = __**

10. Ці шкадавалі вы, будучы цвярозымі, пра тое, што вы гаварылі або рабілі, будучы п'янымі? Ці прызнавалі вы сябе вінаватымі перад людзьмі, якія вас любяць і якім вы абяцалі змяніцца?

11. Ці спрабавалі вы калі-небудзь не піць на працягу пэўнага часу (тыдня, месяца), паколькі адчувалі, што гэта было б добра для вас або таму, што хацелі даказаць, што можаце зрабіць гэта?

12. Ці абяцалі вы самому сабе, што будзеце кантраляваць колькасць выпітага або знізіце гэту колькасць, але не выканалі абяцання?

13. Ці можаце вы цяпер выпіць больш, чым год таму? Ці ёсць тэндэнцыя піць значна больш?

14. Ці былі ў вас правалы ў памяці (вы не маглі прыгадаць некаторыя або ўсе падзеі, якія адбываліся, калі вы былі п'яным)? Ці бывае гэта ў вас цяпер часцей, чым год таму?

15. Ці бывалі ў вас цяжкасці на працы, звязаныя з выпіўкай, — перыядычныя хваробы, прагулы і спазненні, цяжкасці з засяроджваннем, прэтэнзіі з боку калег ці начальнікаў?

16. Ці адчувалі вы сябе часам лепш, калі вы пілі, чым калі не пілі? Ці сапраўды выпіўка пазбаўляла вас ад галаўнога болю, напружання, неспакою, хістанняў настрою?

17. Ці адчувалі вы нарастанне віны з-за сваіх выпівак, але, тым не менш, калі нехта, хто любіць вас, праяўляў свой неспакой, вы станавіліся варожымі і спрабавалі абараняцца?

18. Ці схільныя вы думаць, што вашы праблемы — гэта вынік напружання і стрэсу або што вас не разумее партнёр па шлюбе, або да вас прад'яўляюць празмерныя патрабаванні на працы? Ці было вам сябе шкада, паколькі здавалася, што вас ніхто не разумее? Ці звярталіся вы да алкаголю для суцішэння і заспакаення?

**Колькасць адказаў «так» на пытанні з 10 па 18 __ х 2 = __**

19. Ці ёсць у вас цяга да алкаголю, жаданне выпіць такое моцнае, што вы гатовы рызыкнуць пасварыцца са сваёй жонкай або атрымаць вымову ад начальніка?

20. Ці ёсць у вас схільнасць выпіваць больш, чым вы планавалі напачатку? Ці цяжка вам спыніць піць, калі аднойчы пачалі? Ці выпівалі вы калі-небудзь адразу пасля абуджэння?

21. Ці бывае ў вас часам пасля выпіўкі дрыжанне ў руках, з якім вы не можаце саўладаць? Пасля выпіўкі ці адчуваеце вы сябе фізічна хворым (ванітаванне, траска, слабасць) і/або з'яўляюцца псіхічныя расстройствы (дэпрэсія, неспакой, узбуджэнне, дурны настрой, раздражненне)? Ці паляпшае алкаголь ваша самаадчуванне?

22. Ці ёсць у вас хваробы або парушэнні ў арганізме, якія могуць быць звязаны з алкаголем — гастрыт, перыядычнае расстройства кішэчніка, вірус імунадэфіцыту, насавыя кровацячэнні, гіпертанія, пнеўманія, бранхіт, сэрцабіццё, гепатыт, павялічаная печань, цыроз печані, абсцэсы, парушэнні перыферычнай нервовай сістэмы (радыкуліты, слабасць у руках ці нагах), «белая гарачка», эпілепсія або панкрэатыт?

23. Ці траплялі вы ў бальніцу з-за пашкоджанняў, нешчаслівых здарэнняў або траўмаў, якія адбыліся падчас выпівак і, магчыма, выкліканых тым, што вы выпівалі надта многа?

24. Ці бывалі ў вас калі-небудзь думкі пра самагубства? Ці бывалі ў вас галюцынацыі пасля запою? Ці бывалі ў вас беспрычынныя страхі (напрыклад, ад званка ў дзверы або тэлефоннага званка)?

25. Ці бывалі ў вас страты з-за выпіўкі — страта працы, скасаванне шлюбу, пазбаўленне бацькоўскіх правоў, затрыманне за кіраванне машынай у нецвярозым стане, страта маёмасці, дзелавых сувязяў і г.д.?

26. Ці ігнаруеце вы ежу, асабліва падчас і адразу пасля запою? Ці не перасталі вы займацца сабой — рабіць зарадку, прымаць душ, хадзіць у цырульню, звяртацца да ўрача, калі ёсць праблемы са здароўем?

27. Ці выпіваеце вы менш, чым маглі некалі і калі вы п'яце, ці ёсць у вас схільнасць напівацца да страты прытомнасці або да такога перанасычэння, што вы больш не можаце?

**Колькасць адказаў «так» на пытанні з 19 па 27 __ х 3 = __**

Агульная колькасць адказаў «так»: з 1 па 9 __ , з 10 па 18 __ , з 19 па 27 __.

**Колькасць балаў: 5—8 — ранняя стадыя, 9—27 — сярэдняя стадыя, 28 і болей — позняя стадыя.**

Такі тэст дазваляе пацыентам 21-га рэабілітацыйнага наркалагічнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя спачатку самім выставіць сабе дыягназ і тым самым прызнаць сваё захворванне.

**Існуе і больш лаканічны тэст на залежнасць ад алкаголю:**

**1. Ці спрабавалі вы калі-небудзь кінуць піць? 2. Ці раздражняе вас, калі людзі пытаюцца пра тое, як вы п'яце? 3 Ці адчуваеце вы пачуццё віны за тое, як п'яце? 4. Ці пахмяляліся вы калі-небудзь?**

Алкагалізм — гэта цяжкае, невылечнае, смяротнае захворванне. Па сутнасці, размова ідзе аб страце кантролю над алкаголем. Паводле слоў **загадчыка 21-га рэабілітацыйнага наркалагічнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Уладзіміра ІВАНОВА**, захворванне складаецца з двух элементаў: навязлівай цягі, якая прыводзіць да таго, што алкаголік не можа ўявіць сабе жыццё без алкаголю і нават пасля працяглага перапынку бярэцца за чарку, і фізічнай патрэбы, якая ўзнікае адразу пасля ўжывання першай дозы і выклікае страту кантролю над колькасцю алкаголю.

**Характэрная асаблівасць гэтай хваробы — адмаўленне захворвання перш за ўсё самім хворым.** Складнікі залежнасці — механізмы псіхалагічнай абароны — пастаянна пераконваюць хворага ў тым, што ён не алкаголік. Прыпыніць хваробу на любым этапе развіцця можна пры ўмове прызнання свайго захворвання і змены ладу жыцця. Поўная, абсалютная адмова ад алкаголю — неабходная ўмова для вылячэння. Але гэтага яшчэ недастаткова, паколькі **алкаголь зусім не з'яўляецца асноўнай праблемай алкаголіка. Праблема кожнага алкаголіка — эмацыйная няспеласць, няўменне валодаць сваімі думкамі і пачуццямі, няўменне жыць у згодзе з сабой і наладжваць адносіны з навакольнымі. А паколькі простае спыненне ўжывання спіртнога не вырашае ніякіх праблем хворага, то сама па сабе цвярозасць нічога не дае і амаль непазбежна вяртае яго да цяжкага, але звыклага ладу жыцця. Таму ў той момант, як хворы перастае піць, лячэнне толькі пачынаецца. Вылячэнне патрабуе змянення самога сябе. Ажыццявіць такі пералом у адзіночку амаль немагчыма.**

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Не ўсім пашанцавала быць сапраўднымі прыгажунямі, але быць сапраўднымі жанчынамі могуць усе. Трэба толькі вельмі гэтага захацець і прыкласці сілы, каб жаданне ажыццявілася. Але трэба разабрацца, хто ж яна такая — сапраўдная жанчына? Ну што ж, чытайце і запамінайце. Раптам спатрэбіцца.**

# 24 ПРЫМЕТЫ САПРАЎДНАЙ ЖАНЧЫНЫ



1. Сапраўдная жанчына ўсведамляе, як ёй пашанцавала — нарадзіцца жанчынай.

2. Міф пра тое, што жанчыны старэюць раней за мужчын, прыдумалі самі мужчыны. Насамрэч у жанчын значна больш магчымасцяў з гадамі выглядаць лепш за мужчын-аднагодкаў.

3. Жанчыне можна дагаджаць толькі хворым, старым або вельмі блізкім сваякам. Ва ўсіх астатніх выпадках мужчына павінен дагаджаць жанчыне.

4. Чым больш у жанчыны сваіх любімых заняткаў або захапленняў, тым менш у яе шанцаў займацца чужымі справамі.

5. Жанчыне не варта спяшацца быць камізэлькай для слёз няўдачлівых мужчын. Мужчынскія праблемы павінны вырашаць самі мужчыны.

6. Калі жанчына хоча добра выглядаць пры выпадковай сустрэчы, ёй трэба навучыцца добра выглядаць заўсёды: нават выносячы вядро са смеццем. Увойдзе ў звычку — стане лёсам.

7. Нават калі жанчына добра валодае іголкай і шые сабе ўборы сама, на людзях яна павінна казаць, што ў яе добрая краўчыха, або яна апранаецца ў дарагіх крамах.

8. Да грошай жанчына павінна ставіцца лёгка: калі яны ў яе ёсць, яна павінна ўмець іх траціць. Калі ж іх няма, не павінна засмучацца.

9. Як бы жанчына ні была абмежавана матэрыяльна, у яе гардэробе ўсё роўна павінны быць: хоць бы адно добрае футра і пара прыстойных туфляў.

10. У сябе дома жанчына можа як заўгодна шанаваць, чысціць і засцерагаць сваё адзінае дарагое футра, але ў гасцях непрыстойна патрабаваць ад гаспадароў для яго адмысловага месца. Сапраўдная жанчына павінна з лёгкай нядбайнасцю скінуць футра з плячэй на рукі кавалеру і забыцца пра яго аж да моманту сыходу.

11. Ва ўзаемаадносінах з мужчынамі ў жанчын ёсць цэлы шэраг пераваг:

**а)** жанчына можа дазволіць сабе капрызы і змену настрояў — мужчыну гэта не пасуе;

**б)** мужчына, паабяцаўшы, павінен трымаць слова — жанчына можа і раздумацца;

**в)** мужчына заўсёды павінен прыходзіць своечасова — жанчына мае права на 10 хвілін спазніцца. Але нават калі жанчына ў парушэнне рэгламенту спазнілася на 45 хвілін, ёй досыць, міла ўсміхнуўшыся, проста папрасіць прабачэння.

12. Не спяшайцеся прагнаць кавалера, які не спадабаўся. Чым больш мужчын каля жанчыны, тым больш прыцягальная яна для ўсіх астатніх. Пачакайце. Рана або позна ў гэтае кола патрапіць той, хто вам патрэбен.

13. Побач з мужчынам жанчына мае права рабіць толькі тое, што ёй падабаецца. Выконваць чужыя жаданні — доля мужчын.

14. Якім бы прыемным ні быў вечар, праведзены з мужчынам, начаваць жанчына павінна ў сябе дома. Не мае значэння, выйдзеце вы з-за стала або ўстанеце з пасцелі. І ўсё роўна, што ўжо поўнач або далёка за поўнач. Пакуль не наступіла раніца, вечар працягваецца. А значыць, мужчына павінен будзе вас праводзіць і, да моманту расставання, застацца кавалерам. Калі ж вы паддасцеся на ўгаворы і застанецеся, будзьце гатовыя да змен. З надыходам раніцы мужчына, які не выспаўся, безуважліва цмокнуўшы вас у лоб, будзе спяшацца на працу. А вам давядзецца ў чужым фартуху на чужой кухні рыхтаваць сняданак на хуткую руку. Дадому раніцай вы таксама паедзеце самастойна. Карацей кажучы, «карэта ператворыцца ў гарбуз».

15. Слёзы — моцная зброя жанчыны, але ўжываць яе трэба як мага радзей. Жанчына, якая пастаянна плача, выклікае не спагаду, а раздражненне.

16. Калі жанчына не хоча адказваць на пэўнае пытанне, ёй досыць шматзначна ўсміхнуцца. Ды і ў шматлікіх іншых выпадках усмешка дзейнічае абяззбройвальна.

17. Жанчына можа быць living розна... 

18. Жанчыне не трэба дэклараваць адразу ўсе свае вартасці. Чым больш яе недаацэняць спачатку, тым больш у яе шанцаў выйграць у выніку.

19. Жанчына павінна ведаць сабе кошт, але ніколі не варта яго называць.

20. Уменне жанчыны хораша распрануцца — зачароўвае. Уменне хораша апрануцца — прыварожвае.

21. Мужчынская прыхільнасць? Няма нічога прасцей! З самога пачатку прывучайце мужчыну марнаваць на вас грошы і вольны час. І зусім усё роўна, будзе ён вам дарыць кветкі або дарагія падарункі, стане вадзіць па рэстаранах або макдональдсах, зробіць у кватэры еўрарамонт або ўласнаручна пабеліць столь. Галоўнае — не забывацца, што мужчыны значна больш шануюць тое, што аддаюць, чым тое, што атрымліваюць.

22. Жанчыне, якая ўмее падабацца, не пазбегнуць нагавораў. Але гэта той самы выпадак, калі не трэба прыслухоўвацца да грамадскай думкі. Вышэй галаву! Лепш быць какеткай, чым пляткаркай.

23. Для падтрымання тонусу жанчыне час ад часу трэба нешта ў жыцці змяняць: пальчаткі, працу, мужоў. Калі з працай і мужам пашанцавала, часцей мяняйце пальчаткі.

24. Пакуль жанчына адчувае сябе жанчынай, ёй ніколі не позна пачаць усё спачатку.

# 4 прыметы сапраўднага мужчыны

1. Дабрабыту ён дасягае сам і ў яго ёсць мэта. Ён не просіць міласціну. Яму не прыносяць задавальнення грошы бацькі. Ён зарабляе грошы сам. Ён палюе на поспех і сам кіруе сваёй сям'ёй. Калі яму дастаецца спадчына, ён прымнажае яе ў дзесяць разоў, а не «прафуквае» ў казіно.

Ён ведае розніцу паміж галоўным і другарадным, разумее, што важна, а што — не вельмі. Не марнуе час на дурасці, ад якіх яму або яго сям'і няма ніякай карысці. Вядома, ён можа мець якое-небудзь хобі — напрыклад, страляць па талерачках — але гэта не мэта. Хобі павінна дапамагаць дасягнуць рэальнай мэты. Сапраўдны мужчына сфакусіраваны на ўладзе, грошах і сям'і. Сэкс для яго — не галоўнае. Сэкс будзе, калі будуць улада, грошы і жонка.

2. Ад яго павінна добра пахнуць. Бо так выдатна, калі ад чалавека, з якім размінаешся, прыемна павее!? Да такой ступені прыемна, што ты міжволі павернешся яму ўслед. Але пры гэтым ён не выглядае як жанчына. Ён не фарбуе валасы і не голіць грудзі. Ну манікюр дазваляецца, масаж, мабыць, таксама. Але ўсё, што больш чым гігіена і цырульнік — доля жанчыны. У яго могуць быць прыгожыя і дарагія гальштукі (калі ён іх носіць), але дзве гадзіны абмяркоўваць з уласным стылістам, ці падыдуць чырвоныя штаны да блакітнай кашулі ад Версачы, ён не будзе.

3. Ён не павінен быць скупым. Залатыя горы зусім не абавязковы складнік вобраза. Галоўнае, каб ён не шкадаваў грошай на тое, каб хоць раз на тыдзень звадзіць цябе ў кіно, рэстаран, тэатр або купіць табе якую-небудзь абноўку. Мужчына павінен разумець, што ён — карміцель сям'і, і што калі ён хоча смачна есці дома, быць заўсёды ў чыстым і выпрасаваным адзенні, тады яму давядзецца змірыцца з тым, што яго жанчына раптам адмовіцца хадзіць на працу і будзе гатаваць ежу і мыць бялізну. І яшчэ захоча хадзіць па крамах і бавіць час у кавярнях са сваімі сяброўкамі!

4. Ён проста абавязаны быць стрыманым, цярплівым. Істэрычны, які вечна бубніць і вые, не зважаючы ні на што, мужчына неяк не ўпісваецца ў вобраз Сапраўднага. Ён павінен валодаць сілай волі, мужнасцю і адказнасцю, дзеля таго, каб мы — жанчыны — маглі адчуваць сябе далікатнымі, жаноцкімі, але пры гэтым абароненымі!

Хочаце — верце...

# ЯК РАСПАЗНАЦЬ МУЖЧЫНСКУЮ ЗДРАДУ

*«Усе мужчыны здраджваюць», — кажуць песімісткі, уздыхаючы. «Але ў некаторых атрымліваецца гэта схаваць», — дадаюць яны з хітрай усмешкай.*

**Ні ў якім разе не згаджаючыся з гэтымі сумніўнымі сцвярджэннямі, мы ўсё ж не станем спрачацца з тым, што асобныя прадстаўнікі моцнага полу палігамныя, а некаторыя з іх — палігамныя асабліва. Ці заўсёды можна здагадацца пра тое, што ў адносінах пары з'явілася непажаданая трэцяя асоба? На жаль, не. Часам жанчыны ігнаруюць відавочныя факты проста таму, што баяцца высветліць праўду. Калі вы не з такіх, то мы вам раскажам пра «тыповыя паводзіны здрадніка» ў залежнасці ад пэўнага знака Задыяка.**



**АВЕН** нават думкі не дапускае пра здраду, пакуль ён закаханы — пачуццё захоплівае яго цалкам, не пакідаючы месца для новага захаплення, легкадумнага флірту. Пакуль ён носіць вас на руках, абсыпае падарункамі і знакамі ўвагі, абяцае зоркі з неба і залатыя горы, у яго вернасці можна не сумнявацца. Насцярожыцца варта ў той момант, калі ён пачынае звяртаць увагу на іншых жанчын — Анджэліну Джолі, Аксану Фёдараву... Менавіта гэта з'яўляецца важкім доказам таго, што яго Каханая, якая яшчэ нядаўна з'яўлялася бясспрэчнай уладальніцай тытула Самай Выдатнай Дамы на Зямлі, стала яму менш цікавая. А там і да суседкі Надзеі недалёка. Пра здраду Авена прасцей за ўсё даведацца ад яго самога: ашукваць ён не ўмее і не любіць, а балючую праўду агучвае лёгка, часам нават з некаторай таемнай асалодай. Авен-здраднік задаволены сабой і ні ў грош не ставіць сваё няшчаснае былое Вялікае Каханне — бо яно, урэшце, было памылкай. Небарака, ён яшчэ не ведае, што наступная Дама сэрца з часам таксама акажацца неідэальнай.

**ЦЯЛЬЦЫ**-мужчыны, як правіла, не гоняцца за лаўрамі Казановы і не так лёгка страчваюць галаву. Аднак яны не спяшаюцца з выбарам Той Самай Жанчыны, і калі вы раптам даведаліся, што не з'яўляецеся для Цяльца адзінай, значыць, вы проста былі адным з некалькіх варыянтаў, прынятых да разгляду. Здагадацца пра гэта будзе няцяжка. Калі Цялец не разглядае вас пад мікраскопам, старанна вывучаючы заганы і добрыя якасці, не распытвае пра самыя дробныя здарэнні, не цікавіцца гісторыяй сям'і і планамі на будучыню, не імкнецца даваць парады з любой нагоды — значыць, вы перасталі быць істотнай часткай яго жыцця. Варта таксама мець на ўвазе, што, у адрозненне ад шматлікіх іншых мужчын, Цялец не ганарыцца сваімі перамогамі, яны яго хутчэй засмучаюць, бо кожная з іх становіцца доказам таго, што ён не знайшоў яшчэ сваю адзіную, выдатную і непараўнальную. А таму дакладнай прыкметай здрады Цяльца можа стаць яго змрочнасць, замкнёнасць, песімізм, які дзень за днём павышаюцца. Мужчына з вачамі пакутніка, які панура апусціў галаву, але ні за што не ўпусціць магчымасці ацаніць ножкі сустрэчных дам, — гэта і ёсць Цялец-здраднік. Самае дзіўнае, што многім дамам ён падаецца проста захапляльным.

Самая дакладная прыкмета здрады **БЛІЗНЯТ** — гэта пастаянства. І нічога дзіўнага ў гэтым няма. Узгадайце, як зусім нядаўна ён штодня радаваў вас, дэманструючы новыя грані характару, кардынальна змяняючы свой светапогляд, не стамляючыся перастаўляць жыццё з ног на галаву. Вось тады толькі вы валодалі яго думкамі, толькі вам ён адкрываўся ў поўнай меры, вам нёс свае радасці і смуткі, з вамі дзяліўся пераменлівымі планамі. Як толькі падалося, што ваша вечнае дзіця-мужчына Блізня пасталела, памужнела і адумалася — гэта значыць, што яно ўжо чыёсьці, чужое вечнае дзіця. Праўда, спяшацца з высновамі не варта, усё ж не выключана, што ён проста стаміўся ці перажывае нялёгкія часы.

**РАКУ** нялёгка даецца здрада, бо ён вельмі хоча быць ідэальным сем'янінам, верным каханым і надзейным партнёрам. Акрамя таго, ён здагадваецца пра тое, як балюча быць ашуканым у лепшых пачуццях, і не хоча прымушаць пакутаваць таго, хто яму неабыякавы. Калі новае захапленне ўсё ж неспадзявана наляцела, ён сумняваецца і шукае сабе апраўдання, дзеліцца трывогамі з сябрамі, шукае выйсце, якое б задаволіла ўсе зацікаўленыя бакі, і ахвотна перакладае адказнасць за падзеі на чужыя плечы. Здагадацца пра здраду Рака дапамогуць доўгія гутаркі пра тое, якое няпростае жыццё, якія недасканалыя людзі, як шмат духоўнай работы патрабуюць адносіны з той, каго кахаеш — і як лёгка часам знайсці паразуменне з чалавекам, які яшчэ нядаўна быў зусім чужым. Рак-здраднік смуткуе, аплаквае крушэнне надзей на шчасце, якое было такім магчымым, і не рашаецца зрабіць рашучы крок; ён вінаваціць ва ўсім сябе і несправядлівы лёс, а часам і вас.

**ЛЕЎ** не ўмее хаваць здраду, бо кожнай сваёй абранніцай ён ганарыцца і хваліцца. Ён не ў сілах утрымацца ад таго, каб з'явіцца з чарговай дамай сэрца на свецкім мерапрыемстве, бліснуць яе прыгажосцю, як медалём за адвагу, і не задумваецца пра тое, што ранейшая Выдатная Жанчына можа даведацца пра гэта. Пра здраду Льва лічаць сваім абавязкам паведаміць тыя, каму ён калісьці перайшоў дарогу, бо недахопу ў нядобразычлівых прадстаўнікі гэтага знаку не адчуваюць. Калі ж такіх няма, прыслухайцеся да яго ўласных слоў: хутчэй за ўсё, ён зноў і зноў будзе ўказваць вам на вашы заганы, падкрэсліваючы, што некаторым іншым жанчынам яны не ўласцівыя. Леў-здраднік задаволены сабой, бо ён папоўніў спіс сваіх перамог; у сваёй наіўнасці ён верыць, што зрабіў для вас шмат, ашчаслівіў вас сваёй увагай — а цяпер павінен пацешыць кагосьці яшчэ. Для паўнаты карціны не стае яшчэ адной пікантнай дэталі: Ільвы могуць злёгку перабольшыць ураджай, сабраны на полі адзюльтэра. Проста так, ад дзіцячай непасрэднасці.

**ДЗЕВЫ** славяцца сваёй вернасцю, ды і спакусіць мужчыну, які нарадзіўся пад гэтым знакам Задыяка, пад сілу не кожнай. Але калі да здрады справа ўсё ж дайшла, у падманутай жанчыны ёсць шанц ніколі пра гэта не дазнацца: Дзевы вызначаюцца асцярожнасцю, якой можна было б знайсці і лепшае прымяненне. Калі мужчына-Дзева сустрэў Тую Самую, дзеля якой ён мог бы рызыкнуць праверанымі часам і дарагімі сэрцу адносінамі, ён усё роўна наўрад ці захоча зрабіць гэта, а калі ўсё ж зробіць — тайна застанецца тайнай. Не выключана, што сакрэт раскрые Тая Самая, не падазраючы, што адразу ж перастане быць Той Самай, бо балбатушкам Дзевы не даруюць. Зрэшты, ёсць адна дакладная прыкмета, якая дазваляе адрозніць Дзеву-здрадніка. Гэта фраза: «Я пакахаў іншую», якая не падлягае ні абмеркаванню, ні абскарджанню.

**ШАЛІ** рэдка бываюць абвінавачаныя ў здрадзе, хоць парой праводзяць нямала часу між двух і больш агнёў. Мужчына гэтага знака ўмее калі не кіраваць сваімі пачуццямі, то кантраляваць іх, вылучаючы сваім выбранніцам тыя долі, якіх яны заслугоўваюць. І вы можаце доўга не заўважаць, што ад вашай долі хтосьці адшчыпвае па кавалачку. Ён не прыкладвае намаганняў для таго, каб хавацца, але праўда ўсё ж не выходзіць вонкі: парадокс, магчымы толькі таму, што Шалі ўмеюць будаваць адносіны, якія задавальняюць усіх. Шалі-здраднік можа быць выкрыты толькі дзякуючы неверагодна няўдаламу збегу акалічнасцяў, ці тайнаму страху перад тым, што памянёны збег усё ж будзе мець месца. Часам толькі па павышанай трывожнасці без бачных нагод можна здагадацца, што ў жыцці такога персанажа з'явілася Менавіта Тая.

**СКАРПІЁНАЎ**, нават самых верных і бездакорна маральных, часта падазраюць у здрадзе іх занадта раўнівыя ці не надта разумныя выбранніцы. Сапраўды, нехаця задумаешся, калі на галаву тваю праліваецца то дождж з пялёсткаў руж, то град папрокаў. Скарпіёны складаныя, і ім самім бывае не пад сілу разабрацца са сваімі пачуццямі. Часам знаходзяцца ахвотнікі ў гэтым дапамагчы — наіўныя, даверлівыя асобы, які не падазраюць, які груз яны ўзвальваюць сабе на плечы. Скарпіён-здраднік становіцца такім хітрым, што трапляе ва ўласныя пасткі; ён будуе планы незвычайнай складанасці, але ў момант эмацыйнага напалу — па праўдзе кажучы, аднаго са шматлікіх эмацыйных напалаў, — цалкам можа прагаварыцца. І тут, перш чым прызнаць сябе няшчаснай і ашуканай, паспрабуйце не паверыць вушам сваім. Атрымалася? Ну што ж, значыць, нагод для турботы няма. Бо калі Скарпіён вас абраў, значыць, у вас ёсць інтуіцыя, ад якой нішто не схаваецца.

Нават самы сур'ёзны **СТРАЛЕЦ** заўсёды трохі непаседа. Яго прага прыгод зусім нястрымная, і прыгоды рамантычныя выключэннем не з'яўляюцца. У большасці выпадкаў пра здраду ён нават не задумваецца, а таму не адчувае сябе ні вінаватым, ні няверным — так ужо здарылася, што чарговай вяршыняй, якая патрапіла ў поле яго зроку, апынулася не Джамалунгма, а Яна; нічога не паробіш, трэба дараваць. Яшчэ задоўга да таго, як перамога будзе здабытая, Стралец напэўна распавядзе камусьці пра тое, што збіраецца зрабіць — ну проста дзеля таго, каб яго адгаварылі. Пачуўшы, што нічога складанага ў пастаўленай задачы няма, ён хутка страціць да яе цікавасць. Забаронены плод вабіць Стральца толькі таму, што вісіць высока. Рашыўшыся на штурм і зразумеўшы, што Яна і праўда не параўнаецца з Джамалунгмай, Стралец-здраднік будзе трохі прысаромлены і напэўна пашкадуе, што ўвязаўся ў нявартую яго справу. Менавіта гэтая расчараванасць, якая прыходзіць на змену натхненню першаадкрывальніка, парой і дазваляе выкрыць яго.

**КАЗЯРОГ** доўга будуе планы і абдумвае іх; гэта тычыцца і рамантычных адносінаў. Яшчэ задоўга да таго, як Яна зірне ў яго бок, Казярог узважыць усё «за» і «супраць», складзе ўласнае меркаванне пра тое, як будуць развівацца іх адносіны, і як менавіта ён будзе трымаць іх у тайне. Перш чым дамовіцца з Ёй пра сустрэчу, ён прызвычаіць вас да таго, што заняты і не ў сілах надаваць вам шмат часу; ён акрэсліць маршруты прагулак і абярэ месцы, дзе будуць праходзіць рамантычныя спатканні, ён прадугледзіць усё... Толькі для таго, каб у апошні момант высветліць, што аўчынка вырабу не вартая. Калі ўсё ж узнікае Тая, дзеля якой можна было б прыкладаць усе вышэйапісаныя намаганні, ён рэдка бывае гэтакі абачлівы, бо нечакана і абсалютна губляе галаву. Казярога-здрадніка лёгка выкрыць, бо ён упарта робіць недарэчныя памылкі — адну за адной, у душы разумеючы, да чаго гэта прывядзе, але ўпотай спадзеючыся, што яго прамашкі застануцца незаўважанымі.

**ВАДАЛЕЙ** не любіць хавацца, і калі вымушаны рабіць гэта, то адчувае сябе няўтульна. Таемныя адносіны не дастаўляюць прадстаўнікам гэтага знака вялікага задавальнення, бо даводзіцца прыкладваць сур'ёзныя намаганні для таго, каб усіх трымаць у невядомасці, а ўзнагарода за гэта часам аказваецца больш сціплай, чым ён чакаў. Але ўсё ж прага разнастайнасці часам бярэ верх, і Вадалей збліжаецца з жанчынай толькі таму, што яна зусім непадобная на Тую, Іншую. А потым высвятляецца, што ўсё ж падобная. А потым — ізноў непадобная... Ах, як жа гэта яго стамляе! Бясконцыя ваганні, сумненні ў прынятых рашэннях перабіраюцца са сферы рамантычных адносінаў у іншыя вобласці жыцця, і вось ён месяцамі думае над тым, якая абіўка для канапы лепш, якога колеру павінен быць парасонік, дзе паставіць рабочы стол. Вадалей-здраднік увесь у сумненнях і роздуме. Ён не выбірае паміж сініцай у руках і жураўлём у небе, ён сам і сініца і журавель, і неба і рука, і смутак і радасць. Ох, і нялёгка ж яму даводзіцца, небараку!

Калі вы кахаеце мужчыну-**РЫБ**, то вы кахаеце і яго мары. Ён прывык да гэтага, і шчыра ўпэўнены ў тым, што вы таксама пакахаеце і яго мары пра іншую жанчыну. Не, вядома ён далёка не заўсёды будзе такі адкрыты; ён абмяжуецца намёкамі, ён напусціць туману, ён пераканаецца ў тым, што Яна вам таксама падабаецца. Што вы маглі б пасябраваць. Зладзіць. Калі гэта немагчыма, ён паспрабуе ўладкаваць ваша жыццё. Ён будзе марыць пра тое, што вы сустрэнеце годнага мужчыну, сапраўднага Прынца — і будзе дзяліцца з вамі гэтымі марамі, у надзеі, што вы пакахаеце і іх, а, магчыма, зробіце першы крок да іх ажыццяўлення. Самыя адчайныя могуць мроіць пра ўсходні гарэм. Рыбы — здраднік наіўны, які ніколі не губляе надзеі на тое, што ўсё чароўным чынам уладкуецца як найлепш для ўсіх. А вось Рыбы — каварны здраднік — гэта зусім іншы падвід; ён ужо ведае, куды прыводзяць падобныя мары, і дзейнічае ўпотай, выкарыстоўваючы ўсю сваю фантазію для ўтойвання сумніўных подзвігаў. Ён захапляецца ўласнай бязгрэшнасцю, не падазраючы, што кожны сустрэчы — а ўжо тым больш вы — бачыць у ім авантурыста і наўрад ці захоча падтрымліваць з ім сур'ёзныя адносіны.

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

## Анекдот у тэму

**Як мне падказалі, палюбоўніцу ў тэлефоне лепш за ўсё запісваць пад імем «Нумар не вызначаны».**


**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 16 июля 2010 года открытого аукциона по продаже имущества в 10.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18**

| № п/п | Инв. № | Наименование оборудования | Рыночная стоимость, бел. руб. | Сумма НДС, 20 % | Стоимость с НДС | Задаток с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 3797 | Станок брусовочный ЦМКД -28А | 25 575 930 | 5 115 186 | 30 691 116 | 3 000 000 |
| 2 | 3795 | Станок четырехсторонний продольно-фрезерный С26-2Н5 | 26 369 470 | 5 273 894 | 31 643 364 | 3 100 000 |
| 3 | 3753 | Станок рейсмусовый СР 4-20 | 2 962 820 | 592 564 | 3 555 384 | 300 000 |
| 4 | 3748 | Станок шипорезный ШС-3 | 10 235 550 | 2 047 110 | 12 282 660 | 1 200 000 |
| 5 | 3749 | Станок ПС-4(пресс стыковочный) | 14 630 870 | 2 926 174 | 17 557 044 | 1 700 000 |
| 6 | 3755 | Пресс гидравлический с э/обогревом NPC 6/110 | 53 025 790 | 10 605 158 | 63 630 948 | 6 300 000 |
| 7 | 3812 | Пресс стыковочный ПС-4М | 14 091 160 | 2 818 232 | 16 909 392 | 1 600 000 |
| 8 | 3813 | Станок шипорезный ШС-3 | 11 941 470 | 2 388 294 | 14 329 764 | 1 400 000 |
| 9 | 280 | Станок круглопильный САС-3200 | 7 611 700 | 1 522 340 | 9 134 040 | 900 000 |
| 10 | 3690 | Станок круглопильный САС-2500М | 6 059 060 | 1 211 812 | 7 270 872 | 700 000 |
| 11 | 3746 | Станок ленточнопильный SNA 400 | 3 672 640 | 734 528 | 4 407 168 | 400 000 |
| 12 | 2530 | Станок ленточнопильный столярный ВЗ-357 | 2 910 990 | 582 198 | 3 493 188 | 300 000 |
| 13 | 3779 | Станок ленточнопильный столярный ЛС-40К | 3 429 030 | 685 806 | 4 114 836 | 400 000 |
| 14 | 3735 | Станок вертикально-фрезерный Ф 130-03 | 6 199 590 | 1 239 918 | 7 439 508 | 700 000 |
| 15 | 3736 | Станок вертикально-фрезерный Ф 130-04 | 4 685 560 | 937 112 | 5 622 672 | 500 000 |
| 16 | 3765 | Станок вертикально-фрезерный Ф 130-04 | 4 685 560 | 937 112 | 5 622 672 | 500 000 |
| 17 | 453а | Станок ребросклеивающий Z-650 | 4 843 050 | 968 610 | 5 811 660 | 500 000 |
| 18 | 3847 | Пресс мембранный ПМ -1600 | 20 650 000 | 4 130 000 | 24 780 000 | 2 400 000 |
| 19 | 606а | Пресс гидравлический с э/обогревом ПСГЭ-2М | 37 923 880 | 7 584 776 | 45 508 656 | 4 500 000 |
| 20 | 3714 | Станок шлифовальный ШлПС-6 | 3 350 000 | 670 000 | 4 020 000 | 400 000 |
| 21 | 3700 | Станок шлифовальный ШлПС-6 | 3 350 000 | 670 000 | 4 020 000 | 400 000 |
| 22 | 2997а | Станок шлифовальный ШлПС-6 | 4 690 000 | 938 000 | 5 628 000 | 500 000 |
| 23 | 2143 | Станок калибровально-шлифовальный Libra-2RT 110 | 35 449 400 | 7 089 880 | 42 539 280 | 4 200 000 |
| 24 | 2994а | Фильтр рукавный средней модификации ФРДС-8-4,0 с вентилятором ВРП-4а и ящиком управления | 6 929 170 | 1 385 834 | 8 315 004 | 800 000 |
| 25 | 3788 | Станок скобозабивной ALPHA-3 | 4 447 250 | 889 450 | 5 336 700 | 500 000 |
| 26 | 3778 | Станок шлифовальный ШлПС-6 | 4 690 000 | 938 000 | 5 628 000 | 500 000 |

**Продавец:** «Светлогорский завод сельскохозяйственного машиностроения «Светлогорсккормmaш» (РУП СЗСМ «Светлогорсккормmaш») 247405, р.п. Сосновый Бор, Светлогорский район, Гомельская область, тел.: 8 02342 62159.

**Имущество расположено по адресу:** 247405, ул. Зеленая, д. 2, р.п. Сосновый Бор, Светлогорский район, Гомельская область.

**Шаг аукциона – 5 %.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 13 июля 2010 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (лоты №№ 1-26) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (РУП СЗСМ «Светлогорсккормmaш») р/с 3012000840025, в Светлогорском отд. ОАО «Белпромстройбанк», МФО 151501373, УНН 400019564, ОКПО 02998924.**

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

**Аукцион состоится 16 июля 2010 г. Начало в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, к. 2-18.**
**Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**





(Заканчэнне. Пачатак на 10-й стар.)

Выйшлі на вуліцу, узяліся за рукі і пайшлі па тратуары, радасныя, узрушаныя. Нябачны зарад усё прабягаў між імі, прыцягваў, вымушаў хвалявацца, прыгнятаў волю. Іна не магла растлумачыць сабе, чаму гэта з ёй адбываецца. З Косцікам яна адчувала сябе свабодна і спакойна, проста было добра ад таго, што ён побач. А тут — нейкая віхура, перажыванні, трапятанне сэрца. У глыбіні душы дзяўчына баялася гэтай страсці, але спыніцца не было сілаў. З кожным днём Іна захаплялася ўсё больш і ўсё далей адыходзіла родная вёска, аддаляўся Косцік. А ён, бедачына, кожную суботу чакаў сваю «цыганачку» з Мінска, хадзіў на аўтобусны прыпынак і панура вяртаўся дамоў. У галаве была адна думка: «Яна забылася пра мяне, знайшла сабе гарадскога, лепшага. Ну што ж, нічога не зробіш...» Рыхтавацца да паўторнага паступлення ў ваеннае вучылішча ўжо не было ахвоты, энтузіязм паступова згасаў. Вясной прыйшла павестка з ваенкамата, прызывалі ў армію. І хлопец узрадаваўся: «Ну й добра, пайду служыць і забуду яе. Не лёс, значыць».

Пра тое, што Косціка забіраюць на службу, Іне напісала маці. Дзяўчына вагалася: ехаць ці не? Але рашылася, бо адчувала сябе вінаватай. А ў вёсцы сядзела дома, і толькі калі машына з навабранцам і яго сябрамі паехала ад хаты Косціка, яна выбегла на вуліцу, усхваляваная, са слёзамі на вачах.

Хлопец азірнуўся, Іна махнула яму рукой і пабегла ў хату. Слёзы каціліся градам з вачэй, маці стаяла побач і маўчала.

Летам Іна выйшла замуж за Валерыя і яны паехалі ў студэнцкі будаўнічы атрад. Новыя клопаты, работа, песні пад гітару ля вогнішча, вясёлыя абставіны канчаткова выцеснілі з галавы дзяўчыны першае каханне. А потым — зноў вучоба, сесіі, і нечакана — цяжарнасць. Яна з радасцю бегла да мужа, каб паведаміць навіну. Але рэакцыя Валеры аказалася дзіўнай:

— Якое дзіця? Мы яшчэ не гатовыя, да абароны дыплома застаўся год, трэба рыхтавацца. А тут пялёнкі, распашонкі, ночы не спаць. Не, дарагая, такой раскошы мы не можам сабе дазволіць.

Іна глядзела на мужа і не верыла вушам.

— Валерка, ты што? Гэта ж наша першае дзіця! А што рабіць? Дый многія студэнты маюць дзяцей, і вучацца, і дыпломы атрымліваюць.

— А ты ведаеш, як гэта ўсё цяжка? Я не хачу хадзіць не выспаўшыся, дый грошай не хопіць у нас на бутэлечкі і малачко.

— Дык бацькі дапамогуць, твае, мае, — спрабавала пераканаць яго Іна.

— Не, дарагая! — адрэзаў муж. — Ідзі на аборт — і кропка. Я хачу пажыць на свабодзе яшчэ, малады ўсё-такі.

— А калі не зраблю так, як ты хочаш?

— Тады выбірай: або я — або яно.

— Як ты можаш? — заплакала Іна. — Ты ж казаў, што кахаеш мяне.

— Кахаў. Але я пакуль не хачу станавіцца бацькам сямейства. Мама мая яшчэ маладая, працуе ў тэатры, ёй не будзе часу няньчыцца з дзіцем. Ну, несвоечасова гэта, як ты не разумееш? Ра-на нам, ра-на!

Іна маўчала, глытаючы слёзы. Потым рашуча сказала:

— Ты, як хочаш, а я аборт рабіць не буду.

— Ах, якая гераіня! — з'едліва ўсміхнуўся Валера. — Ну, тады жыві, як ведаеш. Я пераязджаю да мамы.

Муж-мінчанін ледзь вытрымліваў здымную кватэру, а тут з'явілася нагода з'ехаць у прасторную трохпакаёўку бацькоў. Яна не думае пра інтарэсы мужа, якому не тое, што дзіця глядзець, але і ў драмгурток бывае часу не хапае схадзіць.

Працягваць спрэчку Іна не хацела, ды і сэнсу не было. Яна зразумела, што памылілася ў выбары суджанага. Хоць эгаізм Валеры праяўляўся і раней, дзяўчына не заўважала яго, ахопленая ўсёабдымным пачуццём. Цяпер розум праясніўся і прыйшло горкае расчараванне. Але трэба жыць, здаваць экзамены. «Нічога, дачушка, — заспакоілася маладая мама. — Мы справімся». Яна чамусьці была ўпэўненая, што народзіць дачку.

Калі экзамены былі паспяхова завершаны, нарадзілася Веранічка, цудоўнае немаўля з блакітнымі вочкамі. З вёскі прыехала маці, схуднелая Іна выйшла да яе і, заплакаўшы, абняла. «Мамачка, як добра, што ты ў мяне ёсць». Антаніна Сцяпанаўна, ледзь стрымліваючы слёзы, гладзіла дачку па плячах і гаварыла:

— Ну што ты, родная, не плач. Усё ж добра, трэба малако берагчы, супакойся.

Маміна рука была цёплай і добрай, як у дзяцінстве. Іна супакоілася і пачала распытваць маці пра вясковыя навіны і пачула, што Косця пасля арміі стаў вадзіцелем, ажаніўся з дзяўчынай з суседняй вёскі.

— Яна яшчэ хадзіла ў нашу, Сноўскую школу. Не памятаю, як завуць, але прыблізна твайго ўзросту.

Іне чамусьці стала нядобра ў сэрцы, яна змянілася з твару, але прамовіла весела:

— Ну, няхай будзе шчаслівым. А ў нас сваё шчасце.

З раддома іх забіралі бацькі (Іна не паведаміла Валерыю). Дома, у вёсцы, яны разгарнулі пакуначак, цешыліся з немаўляці. І пабеглі клапатлівыя дзянькі, Веранічка з кожным месяцам станавілася ўсё больш цікавай і мілай, чым расчульвала бабулю з дзедам. А тыя стараліся ва ўсім дапамагчы дачцэ і ўнучцы, клапаціліся, каб ім было ўтульна. Іна думала: «Якое шчасце мець бацькоў! А мая дачушка будзе расці без бацькі... Эх, Валера, цяжкасцяў спалохаўся. Што ж ты за мужчына?..»

Калі Веранічцы споўнілася два гады, маці сказала Іне:

— Усё, хопіць сядзець у вёсцы. Едзь у Мінск, уладкоўвайся на працу, а мы з дзедам унучку да школы падгадуем. Потым забярэш да сябе.

Іна вагалася, падумала і згадзілася. У Мінску яна хутка знайшла працу — інжынера-тэхнолага на адным з прадпрыемстваў. Засумаваўшы па справе, людзях, Іна энергічна прыступіла да абавязкаў. Усё пайшло сваім парадкам, маладую жанчыну адзначылі. Яе прыкмеціў і начальнік цэха Міхаіл Ішчанка, мужчына сярэдняга ўзросту, з добрымі вачыма. Іншы раз ён з такой адданасцю і любоўю глядзеў на Іну, што яна бянтэжылася. Зеленаватыя вочы Пятровіча лашчылі твар жанчыны, усю яе зграбную постаць, і яскрава гаварылі тое, пра што ён маўчаў. Нарэшце адважыўся, запрасіў Іну Міхайлаўну ў тэатр. Яна без энтузіязму згадзілася, але пастаноўку «Кармэн» паглядзела з цікавасцю, ды і оперны тэатр ёй спадабаўся. Міхаіл Пятровіч быў далікатны, уважлівы і ветлівы. Іне рабілася трошкі ніякавата ад яго ласкавага позірку, але прыемна. І пачаліся сустрэчы, якія пастулова перараслі ў блізкія адносіны. Іна прывыкла да гэтага чалавека, як прывыкаюць да новай працы, кватэры. Яна не забыла Валеру, яшчэ трывожылі ўспаміны. Але ён не шукаў сустрэч, і жанчына рашылася: прыняла прапанову Пятровіча стаць яго жонкай. Падзею сціпла адзначылі ў кавярні, Іна пераехала з Веранікай у двухпакаёвую кватэру мужа. Ён папярэджваў кожнае яе слова, погляд, жаданне і часта паўтараў:

— Іначка, які я шчаслівы! Ты ў мяне — самая лепшая, самая прыгожая.

Жонка ўсміхалася, глядзела на Міхаіла і думала: «Можа, і я буду з ім шчаслівай. Што яшчэ трэба?»

Праз год яна нарадзіла сына. Сярожка рос вясёлым, цікаўным хлопчыкам, на радасць бацькам. Пятровіч аднолькава строга і пяшчотна ставіўся да Веранікі і Сярожы, дапамагаў Іне па гаспадарчых справах, ахвотна хадзіў у краму. На працы захапляліся (сёй-той і зайздросціў) дружнай сям'ёй.

Аднойчы Міхаіл прыйшоў з працы стомлены, бледны.

— Што з табой? — спытала Іна.

— Не хвалюйся, дарагая, стаміўся нешта. Я паляжу...

Такія прыступы стомленасці, слабасці пачалі паўтарацца. Іна ўгаварыла мужа легчы ў бальніцу на абследаванне. Прысуд урачоў аказаўся кароткім і страшным: анкалогія. Міхаіл Пятровіч не падаў духам, супакойваў жонку, а пра сябе думаў: «Цяжка ёй будзе адной без мяне, з двума дзецьмі...»

Некалькі месяцаў Іна разрывалася паміж працай, домам, бальніцай і аптэкамі. Усё закончылася, Пятровіч адышоў у лепшы свет. Для Іны гэта аказалася моцным ударам, жыццё стала здавацца пустым і чорным. Дзеці акружылі яе клопатам і ўвагай, угаворвалі. Вераніка ўжо вучылася ў інстытуце, радавала маці сваім стараннем і поспехамі. Іна пастулова адышла, навучылася ўсміхацца.

...Алёна выслухала споведзь землячкі і сказала:

— Давялося табе, Інка, перажыць... Але ж трэба жыць, дзеці ў цябе добрыя. Ой, а мне ж ужо збірацца час. Зараз муж пад'едзе, ён у мяне шаўковы, слухаецца.

Пад'ехала машына, і вадзіцель выгукнуў:

— Алёна, давай, ідзі ўжо, трэба ехаць.

Алёна ўстала, сказала Іне «Бывай!» і пайшла да машыны.

— Усё забраў? — спытала мужа.

— Усё, усё, сядай ужо.

На нейкі момант ён выйшаў з-за руля, Іна глянула на яго і ледзь не абамлела: гэта быў Косцік, распаўнелы, але з такім знаёмым блакітным позіркам.

— Іна?.. — разгублена спытаў ён.

Жонка падганяла:

— Паехалі ўжо, няма часу.

Косцік пакорліва сеў за руль і машына кранулася.

Нібы ў сне, ішла Іна да падземнага перахода. Яе ахапіў нейкі жаль, пачуццё крыўды. Чаму Алёна не сказала, што Косцік яе муж?

У падземным пераходзе сталага веку гарманіст расцягваў мяхі баяна і гучна выводзіў: «Виновата ли я, виновата ли я, виновата ли я, что люблю...»

